СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 6.34, 19.38, 13.03;
Віцебск — 6.23, 19.29, 13.06;
Магілёў — 6.24, 19.27, 13.03;
Гомель — 6.24, 19.20, 12.56;
Гродна — 6.52, 19.50, 12.59;
Брэст — 6.52, 19.52, 13.00.
МЕСЯЦ:
Поўня 12 верасня
ІМЯНІНЫ:
Івана.

ЗВЯЗДА

11 ВЕРАСНЯ 1992 г.
пятніца, № 183 (21961)
● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

ВОЗГАЛАС

ЧП НА ПЛОШЧЫ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ: СПАЛЕНЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫ СЦЯГ

ТАКОЕ ЗЛАЧЫНСТВА СУРОВА КАРАЕЦЦА ВА ЎСІХ КРАІНАХ СВЕТУ

Сапраўдны акт вандалізму ўчынены ў ноч з 8-га на 9-е верасня на плошчы Незалежнасці пасля заканчэння свята Беларускай вайсковай славы — невядомымі спалены 8-метровае палотнішча нацыянальнага сцяга і герб «Пагоня», якія ўпрыгожвалі плошчу. Каля кучкі попелу і абгарэлых рэшткаў тканіны знойдзены балончык з гаручай вадкасцю, рассыпаныя запалкі. Між тым, арганізатары свята мелі дамоўленасць з адным з міліцэйскіх каператываў аб ахове трыбуны, якая пакідалася на ноч, і афармлення. Мастак М. Купава напярэдадні папярэдзіў дзяжурнага па Маскоўскаму РАУС аб неабходнасці прасачыць за захаваннем атрыбутыкі, і яму было паабяцана, што гэта будзе зроблена. Ніхто, уключаючы міліцыю, што няса ахову помніка Леніну і Дома ўрада, не бачыў, як адбывалася крымінальнае злачынства, якое сурова караецца ва ўсіх краінах свету, хоць не бачыць гэтага было немагчыма. Адзін з арганізатараў свята, Яўген Шунейка, лічыць, што ў спальванні нацыянальнага сцяга ўдзельнічала цэлая група злачынцаў — аднаму чалавеку гэта было б не пад сілу.

Учора старшыня Беларускага народнага фронту З. Пазьняк звярнуўся ў гарадскую пракуратуру па факту ўчыненага злачынства, бо ніяк нельга моўчкі рэагаваць на яго.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

ДЗЕЛАВЫЯ КОЛЫ ПАВІННЫ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ

9 верасня ў Мінск з двухдзённым візітам прыбыў былы прэм'ер-міністр дзяржавы Ізраіль Іцхак Шамір. Ён канёс візіт Старшыні Савета Міністраў Беларусі Вячаславу Кебічу, з якім пазнаёміўся ў час знаходжання афіцыяльнай дэлегацыі нашай рэспублікі ў Ізраілі гэтым летам.

Трэба выкарыстаць увесь ваш уплыў на прадпрымальнікаў, каб дзелавыя колы нашых краін сталі, нарэшце, паўней супрацоўнічаць,— такое пажаданне выказаў на сустрэчы з высокім госцем прэм'ер-міністр Беларусі.

Затым былы кіраўнік урада Ізраіля сустрэўся з прадстаўнікамі яўрэйскіх абшчын у Мінску, пабываў у Ізраільскім інфармацыйным цэнтры «Сохнут».

Раніцай 10 верасня ў Іцхака Шаміра намечана сустрэча з дэпутатамі парламента і гутарка са старшынёй Камісіі па міжнародных справах і знешнееканамічных сувязях Вярхоўнага Савета рэспублікі Пятром Садоўскім. Затым былы прэм'ер-міністр Ізраіля адбудзе ў гарадскі пасёлак Ружаны, адкуль ён родам, дзе наведае яўрэйскія могілкі.

(БЕЛІНФАРМ).

ПА ЧУТКАХ І НА СПРАВЕ

ЦІ БЫЛІ АДРЭЗАНЫЯ ГАЛОВЫ?

Не так даўно ў штотыднёвіку «Московские новости» з'явілася кароценькая інфармацыя, быццам паблізу Мінска, у лесе, былі знойдзены расчлянённыя трупы, якія туды трапілі з НДІ анкалогіі. Жудасную навіну падхапілі і рэспубліканскія сродкі масавай інфармацыі.

Карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да старшага следчага Мінскай міжрайпракуратуры Ігара СЕЎРУКА.

— Ігар Рыгоравіч, дык што ўсё-такі здарылася каля пасёлка Ляснога?

— Трэба сказаць, што «Московские новости» крыху «ўпрыгожылі» гэты факт. Не было ніякіх адрэзаных галоў, не было трупаў. Было восем поліэтыленавых мяшкоў з пасляаперацыйным матэрыялам. Ну, ведаеце, што застаецца пасля хірургічных аперацый —

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Вось такая капуста, нягледзячы на засушлівы год, вырасла на полі фермера з вёскі Іванаўка Крычаўскага раёна Анатоля МУРАШКІ. На сваіх сямі гектарах ён вырасціў сёлета нядрэнны ўраджай агародніны — агуркоў, бульбы, сталовых буракоў, на славу ўдаўся і ячмень.

Па падліках Анатоля Сямёнавіча, у гэтым годзе ад сваёй працы ён атрымае паўмільёна рублёў прыбытку.

Фота Валерыя БЫСАВА. (Белінфарм).

С. ШУШКЕВІЧ І Я. ШАПАШНІКАЎ КАНСУЛЬТУЮЦЦА

Па запрашэнню Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі Станіслава Шушкевіча беларускі парламент наведаў галоўнакамандуючы Аб'яднанымі Узброенымі Сіламі СНД маршал авіяцыі Яўген Шапашнікаў, які ўдзельнічаў у мінскай нарадзе міністраў замежных спраў СНД.

Станіслаў Шушкевіч і Яўген Шапашнікаў правялі кансультацыі па праблемах, што прадстаўляюць узаемную цікавасць. Дэталёва абмеркаваны пытанні аб скарачэнні Узброеных Сіл, вывадзе стратэгічных войск з тэрыторыі Беларусі. Старшыня Вярхоўнага Савета рэспублікі пацвердзіў цвёрдасць пазіцыі Беларусі ў адносінах да папярэдніх дамоўленасцей па ваеннаму супрацоўніцтву.

У ходзе размовы бакі выказалі ўзаемную ўпэўненасць у тым, што пастаянныя кантакты па ваенных пытаннях будуць садзейнічаць іх рацыянальнаму вырашэнню.

АБ ВІЗІЦЕ БЕЛАРУСКАЙ УРАДАВАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ Ў КАЗАХСТАН

15 верасня пачнецца афіцыяльны візіт дэлегацыі ўрада Рэспублікі Беларусь на чале са Старшынёй Савета Міністраў Вячаславам Кебічам у Казахстан. Як вядома, паміж Беларуссю і Казахстанам даўно існуюць традыцыйныя адносіны дружбы і супрацоўніцтва. Адбываюцца рэгулярныя сустрэчы і кансультацыі кіраўнікоў урадаў абедзвюх дзяржаў, шырацца прамыя сувязі паміж прадпрыемствамі і арганізацыямі.

Маючы адбыцца візіт стане яшчэ адным добрым прыкладам дружалюбнасці і супрацоўніцтва ў той час, калі навокал рушацца эканамічныя сувязі, шырацца канфрантацыя і варожасць. У Алма-Аце адбудуцца перагаворы паміж урадамі Беларусі і Казахстана. Будзе падпісаны шэраг важных міжурадавых пагадненняў. Сярод іх — аб стварэнні міждзяржаўных гаспадарчых структур, цэнаўтварэнні на прадукцыю міждзяржаўнага абмену, падатковай палітыцы, прынцыпах супрацоўніцтва ў галіне паветранага транспарту, каардынацыі дзейнасці чыгуначнага транспарту, аўтамабільных зносінах, па пытаннях сувязі.

Плануецца таксама падпісанне дадатковага пагаднення паміж урадамі Беларусі і Казахстана аб пастаўцы ў нашу рэспубліку збожжа ўраджаю 1992 года і аказанні дапамогі Казахстану ў правядзенні ўборкі ўраджаю. Паводле папярэдняй дамоўленасці, Беларусь атрымае з Казахстана больш 2 мільёнаў тон збожжа, што практычна задаволіць патрэбнасць рэспублікі ў ім.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Вячаслаў КЕБІЧ:

«Рукі ўрада звязаны законамі...»

Эканамічная сітуацыя ў рэспубліцы на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна была ахарактарызавана як складаная, але не катастрафічная. Старшыня Дзяржэканомплана С. Ліяг адзначыў, што, нягледзячы на негатыўныя тэндэнцыі, у цэлым сітуацыя застаецца пад кантролем. Асноўныя турботы ўрада зараз — лібералізацыя цэн. Але калі ў студзені гэтага года цэны вырасліна 500 працэнтаў у параўнанні з пачаткам леташняга года, у лютым — на 300, у сакавіку — на 240 працэнтаў, то ў ліпені рост цэн на прамысловыя тавары склаў усяго 11 працэнтаў. Так што і тут можна сказаць, што сітуацыя стабілізуецца, тым больш, што ўрад мае намер захаваць манаполію цэн на асноўныя прадукты харчавання і ў першую чаргу — на хлеб.

Агульны ўзровень прамысловай вытворчасці ў параўнанні з мінулым годам знізіўся на 14—16 працэнтаў, і толькі выраб алкагольных напіткаў увесь гэты час пастаянна расце (на душу насельніцтва прыпадае цяпер 11 літраў), што не можа не трывожыць. А ўвогуле сітуацыя на спажывецкім рынку такая, што на прылаўках быццам бы і ляжыць ўсё, але нічога не купіш: 80 працэнтаў заработнай платы ідзе на набыццё жыццёва неабходных тавараў і толькі 20 — на ўсё астатняе. Трывожыць сітуацыя і з ростам беспрацоўя, якое мае твар пераважна малады і жаночы — на сённяшні дзень мы маем каля 13 тысяч страціўшых работу людзей, якія афіцыяльна атрымалі статус беспрацоўнага. У такіх умовах нічога не застаецца рабіць, як ствараць цэлую сістэму заахвочвальных мер для тых прадпрыемстваў, якія рэзервуюць рабочыя месцы для маладых спецыялістаў і інвалідаў. Вядома, элементы рынку заключаюцца не толькі ў гэтым: у нас дзейнічаюць каля 20 камерцыйных банкаў, столькі ж біржаў, 500 сумесных прадпрыемстваў. З апошнімі, праўда, справа складаная: толькі трэць з іх працуе, і то большасць з іх, як сказаў С. Ліяг, займаецца «выцягваннем» грошай, а не выпускам тавараў ці аказаннем паслуг.

Сітуацыя ў сельскай гаспадарцы такая: валавы збор збожжа склаў сёлета 7,8 млн. тон, што значна лепш, чым чакалася. Збожжавых сабрана па 31 цэнтнеру з гектара — па гэтым паказчыку мы перасягнулі нават Украіну. Але збожжа ўсё роўна недастаткова: больш чым 2 млн. тон трэба купляць за мяжой. Ёсць дамоўленасці з Казахстанам, Стаўраполлем, Кубанню. Аднак падпісаныя раней дагаворы без ліцэнзіі на вываз застаюцца звычайнай паперай. Значыць, зноў трэба будзе траціць час, даводзячы гэту справу да канца.

Валавы збор бульбы чакаецца каля 7.800 тыс. тон. Значна больш, чым летась, — на 124 тыс. га — пасаджана яе сёлета на прысядзібных участках, так што праблемы з «другім хлебам» не будзе. Цукар. Праблема тут немалая — чакаецца нізкая ўраджайнасць цукровых буракоў, а таму замест 150 тыс. тон цукру рэспубліка выпусціць усяго каля 80 тыс. тон. Астатняе давядзецца купляць за мяжой, аднак на ўзровень 36 кг на душу насельніцтва ў год мы выйдзем.

Значна знізілася ў рэспубліцы спажыванне мяса, у асноўным з-за высокіх цэн. Між тым, паказчык у 67 кг на чалавека ў любым выпадку неабходна захаваць, падкрэсліў С. Ліяг.

Называлася тут, вядома, і многа іншых лічбаў, прыводзіць іх усе няма патрэбы. У рэшце рэшт кожны сам зможа ацаніць вынікі года, таму нават не столькі стан эканомікі рэспублікі выклікаў далейшую дыскусію. Галоўным пытаннем, як было адзначана, застаецца навядзенне дысцыпліны і парадку ў вытворчасці і грамадстве.

Вось аб чым сведчаць вынікі сацыялагічных даследаванняў, якія прывёў у заключным слове Старшыня Савета Міністраў В. Кебіч. Першачарговай задачай дзейнасці парламента і ўрада рэспублікі апытаныя лічаць: барацьбу са злачынасцю (40 прац.), барацьбу са спекуляцыяй (39 прац.), з ценявой эканомікай, умацаванне калгасаў (па 32 прац.), павышэнне ўзроўню прамысловай вытворчасці (29 прац.) і сацыяльную абарону маламаёмасных слаёў насельніцтва (25 прац.). У самы канец, як падкрэсліў В. Кебіч, аднесены сацыяльныя пытанні. Людзі сёння баяцца выйсці на вуліцу: пагроза быць абрабаваным, збітым, зняважаным вісіць над кожным чалавекам, хоць міністр унутраных спраў мне аптымістычна рапартуе: абстаноўка ў барацьбе са злачынасцю рэзка палепшылася. Маўляў, калі раней рост злачынасці складаў 18 працэнтаў, то цяпер — «усяго» 15. Разумееце, паляпшаецца барацьба са злачынасцю таму, што змяншаецца працэнт росту. Дзе яшчэ такое можна сустрэць?

Карупцыя і спекуляцыя — вось дзе трэба па-сапраўднаму раскрыць вочы, адзначыў Вячаслаў Францавіч. Возьмем армію: палову генералаў не толькі трэба звальняць за дапушчаныя злоўжыванні, але і аддаваць пад суд. Як мог дадумацца былы камандуючы Беларускай ваеннай акругай А. Кастэнка выдаць распараджэнне аб тым, што бензін трэба адпускаць для ваеннаслужачых бясплатна? На працягу месяца набывалі па 4 тоны. Выкарыстанне транспартных самалётаў. Машыны штучна ўдзешаўляюцца да такой ступені, што затым прадаюцца за бясцэнак. Расследаванне тут трэба прадаўжаць і прадаўжаць. Ёсць жа загад: нічога не вывозіць з вайсковай маёмасці за межы рэспублікі, але падпісваюцца нейкія паперы і ўсё, што можна, вывозіцца. Не ўкладваючы ніводнага ўласнага рубля, будуюцца шыкоўныя дачы, бессаромна выкарыстоўваецца бясплатная рабочая сіла — салдаты. Паўтараю, усе гэтыя факты пацверджаныя. Дык якія ж яшчэ законы патрэбны праваахоўным органам, каб змагацца са злачынасцю?

Гэта пра армію. А што робіцца ў нас на вытворчасці — поўная адсутнасць працоўнай дысцыпліны. Хто ўспомніць, як дзейнічаюць санэпідэмстанцыі, калі яны апошні раз заяўлялі аб сабе? Людзі, якія выпускаюць недабраякасную прадукцыю, і работнікі СЭС сёння — практычна адно і тое ж. Міністэрства аховы здароўя і міністр Казакоў бяздзейнічаюць.

Ахова грамадскага правапарадку. Нам дакладваюць: колькасць злачынстваў меншая, чым у іншых рэгіёнах СНД. Але на каго мы павінны раўняцца —на тыя рэспублікі, дзе ідзе грамадзянская або міжнацыянальная бойня, дзе жыццё не ставіцца ў грош? Так што трэба думаць аб тым, як накарміць народ і як, адначасова, супакоіць яго.

Дэпартамент цэн сёння таксама не працуе. Вось, напрыклад, параўнаўчая табліца цэн на прадукты харчавання. Здавалася б, усё добра: мяса танней, малако —танней... Даходзім да бульбы — у іншых рэспубліках цана 3, 5, 11, максімум 16 рублёў. У нас —асноўных вытворцаў — 28 рублёў 50 капеек. А ўсё ад таго, што ў ланцугу «поле —прылавак» вялікая колькасць розных пасрэднікаў, якіх лепш назваць нахлебнікамі. Мінсельгасхарчу тут таксама трэба наводзіць парадак. Урад возьме гэту справу пад свой кантроль, паабяцаў Старшыня Савета Міністраў.

Калгасы і саўгасы пагражаюць сёння забастоўкамі, тым, што не будуць адгружаць прадукцыю гораду. Дык урад хоць сёння гатовы апусціць закупачныя цэны, але ў такім выпадку «лягуць» і самі гаспадаркі — 186 з іх у Беларусі і так на сённяшні дзень поўныя банкруты. Тое ж самае будзе і з астатнімі без дзяржаўнай падтрымкі. Вядома, гэтага нельга дапусціць, трэба шукаць шляхі ўзаемаразумення.

Далей В. Кебіч закрануў вельмі вострую і далікатную тэму — злоўжыванні службовым становішчам. Пра армію ўжо гаварылася вышэй, але і гаспадарнікі — кіраўнікі прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, савецкія работнікі таксама «праявілі» сябе ў гэтай справе. У вытворчых калектывах падае дысцыпліна, адказнасць за даручаную справу, пануе атмасфера бескантрольнасці, што спрыяе росту колькасці правапарушэнняў. Расце колькасць крадзяжоў дзяржаўнай маёмасці, паліва, тэхнікі, жывёлы прама з фермаў,

(Заканчэнне на 3-й стар.).

РАДЫЁ ФАКТ

У БРЭСЦЕ АДКРЫЎСЯ РЭЧАВЫ РЫНАК. Дэпутаты гарсавета доўга спрачаліся, перш чым прынялі такое рашэнне. За рынак былі тыя, хто справядліва бачыў у ім канкурэнцыю малому гандлёваму бізнесу. Супраць — хто хваляваўся, што яшча больш актывізуецца злачынасць у горадзе. Цяжка выпрацоўвалася рашэнне. Аднак агароджана пляцоўка ў блізкім прыгарадзе Брэста на ўзбярэжжы ракі Мухавец. Рынак запрашае наведвальнікаў. Працаваць гандлёвыя рады будуць тры разы на тыдзень.

●

РАСІЯ НАКІРАВАЛА ГРУПУ АФІЦЫЯЛЬНЫХ АСОБ у Гавану, каб абмеркаваць пытанні вываду расійскіх войск з Кубы. На Кубе, дарэчы, да цяперашняга часу знаходзіцца калі 1.600 салдат, якія займаюцца падрыхтоўкай і навучаннем кубінскіх ваенных.

●

УДАВА АНДРЭЯ САХАРАВА АЛЕНА БОНЭР знаходзіцца з візітам у Канадзе. У інтэрв'ю газеце «Сіцізен» яна падзялілася ўражаннямі аб цяперашняй сітуацыі ў Расіі. Бонэр заявіла, што «ў краіне не можа быць сапраўдных рэформ, пакуль урад Ельцына не прыватызуе зямлю і не прыме новую канстытуцыю». Яна дадала, што, нягледзячы на перамены ў кіраўніцтве, бюракраты камуністычнай эпохі працягваюць кіраваць краінай такім жа чынам, як яны рабілі гэта на працягу 70 гадоў.

●

СЕНСАЦЫЯ НУМАР АДЗІН НА БРЫФІНГУ, які адбыўся ў прэс-цэнтры Міністэрства замежных спраў, стала заява старшыні камітэта Вярхоўнага Савета Расійскай Федэрацыі Сяргея Сцяпашына аб магчымым хуткім прыездзе ў Маскву дырэктара ЦРУ Роберта Гейтса. Паводле слоў парламентарыя, матэй такога візіту будзе, хутчэй за ўсё, абмеркаванне пытанняў супрацоўніцтва паміж разведвальнымі ведамствамі Расіі і Злучаных Штатаў.

●

КАЛЯ ПЯЦІСОТ ДОБРААХВОТНІКАЎ Канфедэрацыі горскіх народаў Каўказа гатовы да перапіскі ў Абхазію з Чачні, і іх не спыняць ніякія кардоны ўнутраных войск Расіі, — заявіў старшыня парламента Канфедэрацыі Юсуп Сасланбекаў. «Няспынныя баявыя дзеянні ў Абхазіі не пакідаюць выбару Канфедэрацыі горскіх народаў, — сказаў ён карэспандэнту РІА. — Калі панінуць сёння абхазцаў без падтрымкі, заўтра настане чарга іншых малых народаў».

●

ЗА АПОШНІЯ ПАЎТАРА ГОДА сем супрацоўнікаў службы знешняй разведкі Расіі здрадзілі. Яны нанеслі значны ўрон, раскрыўшы кадравы састаў службы знешняй разведкі і яе агентуры, галоўным чынам у навукова-тэхнічным напрамку разведкі. У выніку разведка вымушана перабудоўваць работу рада падраздзяленняў. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Маскве першы намеснік дырэктара службы знешняй разведкі Расіі Вячаслаў Трубнікаў.

ВАША ЗДАРОЎЕ

Масаж ступні

На падэшвах ног існуюць кропкі, звязаныя з пэўнымі зонамі арганізма. Масіруючы іх, можна зняць боль, атрымаць лячэбны эфект. Але, вядома, нельга лічыць самамасаж панацэяй ад усіх хвароб. Вы яго можаце выкарыстаць менавіта для прафілактыкі некаторых захворванняў.

Спатрэбіцца для такога масажу дыванок з пупышкамі, які звычайна кладуць для чысткі абутку перад уваходнымі дзвярамі. Пакладзіце яго ў ваннай і, мыючыся, тапчыцеся па ім на здароўе! Можна катаць валок па падлозе (ад 3 да 10 хвілін). 1 — гайморавая і лобныя пазухі, зубы; 2 — гіпафіз; 3 — патыліца і вобласць горла; 4 — вочы; 5 — вушы; 6 — шчытападобная і парашчытападобная залозы; 7 — бронхі; 8 — сэрца; 9 — печань; 10 — нырки; 11 — страўнік і дванаццаціперсная кішка; 12 — падстраўнікавая залоза; 13 — тонкая кішка; 14 — сцягно і калені; 15 — паяснічна-красцовы аддзел пазваночніка.



Можна выкарыстаць спецыяльны масажны дыванок. Бываюць у магазінах і масіруючыя ступню пакаёвыя тапачкі, а некаторыя вяжуць бугрыстыя дыванкі... Выбірайце, што вам больш даступна і больш падабаецца.

Цудоўны «масажны дыванок» падрыхтавала для нас на беразе рэк і мора прырода — пясок, галька. У цэнтрах лячэбнай фізкультуры пабудаваны спецыяльныя басейны, на дне якіх — зярністы пясок, каменьчыкі. Калі хочаце, можаце зрабіць такі «басейн» у сябе дома — у тазіку.

ЯК ПЕРАМАГЧЫ СТРЭС

Не дапускайце спрэчак у сям'і

Супраціўленне стрэсу пачынаецца дома. Для таго, каб справіцца з хуткімі пераменамі, пастаяннымі раздражняльнікамі і шматлікімі сюрпрызамі, якія падносіць жыццё, неабходна стварыць стабільную «базу для операцый» дома. Псіхолагі даўно выявілі, што члены сям'і, дзе падтрымліваюць адзін аднаго, лягчэй спраўляюцца з крызісамі. Вось некалькі парад, як абараніць вашу сям'ю ад стрэсаў.

Знаходзьце час, каб абмеркаваць дома накопленыя праблемы: вы чакаеце, што выслухаюць вас, але і вам трэба ўмець раздзяляць трывогі іншага боку.

У сям'і неабходны і агульныя «сходы», дзе ўсе маглі б прыняць удзел у абмеркаванні планаў, распарадку, пошуку вырашэння канфліктаў.

Вучыцеся слухаць блізкіх, знаходзіць тое, што схавана паміж «радкамі». Задавайце пытанні, калі вы не разумееце, што хоча сказаць вам член сям'і.

Калі ў вас не склалася традыцыя сумесных святаў, паездак, забаў, тэрмінова завядзіце яе ў вашай сям'і.

Вучыцеся майстэрству кампрамісу.

Будзьце гібкія, калі сітуацыя патрабуе — адступіце ад сваіх пазіцый. Гэтыя якасці вам асабліва спатрэбяцца, калі нехта ў сям'і страціў работу.

Стварайце ўмовы для выхавання індывідуальнасцей у вашай сям'і. Дапамагайце жонцы адрывацца ад надакучлівых хатніх спраў. Не параўноўвайце братоў і сясцёр, хто лепшы, хто горшы— у кожнага павінна быць свая «прастора» для развіцця.

Не пераацэньвайце важнасць поспехаў у вучобе і фінансавых дасягненняў членаў вашай сям'і — іх чалавечыя якасці больш важныя.

СМАЧНА ЕСЦІ!

Пеннік

Капуста белакачанная — 1 кг, яйкі — 3 шт., масла — 3 ст. лыжкі, смятана — 4 ст. лыжкі, сухары — 1 шклянка, малако — 1 шклянка, цыбуля — 4 галоўкі, цукар, чорны молаты перац, соль па смаку.

Ачышчаную капусту шынкуюць, заліваюць малаком, прыпускаюць да гатоўнасці, ахалоджваюць і прапускаюць цераз мясарубку. У падрыхтаваную капусту дабаўляюць молатыя сухары, расцёртыя з цукрам яечныя жаўткі, растопленае масла, нарэзаную і злёгку падсмажаную цыбулю, соль, перац, узбітыя бялкі. Усё добра перамешваюць, выкладваюць масу на змазаную маслам патэльню і запякаюць у духоўцы. Падаюць пеннік са смятанай.

Можа спатрэбіцца

✦ Вы купілі ў магазіне вельмі салёныя агуркі? Не засмучайцеся, справу можна паправіць. Такія агуркі «лечыць» таматны сок. А няма соку—таксама не бяда. Разбаўце да кансістэнцыі соку таматны соус, закіпяціце і астудзіце. Дабаўце солі, часнаку, свежага ці сушанага зяленіва — і заліўка для агуркоў гатова. Вытрымаўшы ў ёй (у эмаліраваным посудзе) агуркі некалькі дзён, вы іх не пазнаеце — яны стануць цвёрдымі, у меру салёнымі, духмянымі.

✦ З рэшткаў тварагу, сыру, кефіру, можна згатаваць страву тыпу «хачапуры».

У місцы разатрыце тварог, на буйной тарцы натрыце сыр, уліце кефір, дадайце сырое яйцо, крыху соды і муку, каб атрымалася цеста, як на густыя аладкі.

Смажце на любым тлушчы з абодвух бакоў на добра разагрэтай патэльні. Атрымліваюцца апетытныя прасныкі.

✦ Хочаце здзівіць гасцей? Зрабіце зусім селядцовы фаршмак з... капусты.

Разбярыце невялікі качан на лісты, зрэжце з іх патаўшчэнні і пакладзіце ў падсолены кіпень. Варыце да мяккасці (не пераварвайце!). Тым часам у вас замочаны ў малацэ 3—4 лустачкі батона.

Зліце ваду, няхай лісты астынуць. Добра іх адцісніце і прапусціце праз мясарубку разам з адціснутым батонам і двума крутымі яйкамі. Добра вымешайце, дадайце алей, воцат і соль — па смаку.

Гатовы фаршмак выкладзіце ў селядцоўку, паліце соусам (расцёрты ў алеі круты жаўток і крыху воцату), а зверху ўпрыгожце кольцамі цыбулі.

Будуць есці і нахвальваць: смачны селядцовы фаршмак!..

Рыбныя «тонкасці»

Здаецца, якое ўжо тут майстэрства — парэзаць ды падсмажыць рыбу. Аднак... Непластаваную рыбу нарэзаюць на кавалкі ўпоперак, пачынаючы з галавы. Нож трэба трымаць пад вуглом 45 градусаў. Філе нарэзаецца ад хваста, паклаўшы яго ўнутраным бокам уверх. Нож ставіцца пад вуглом 30 градусаў. Тады порцыі атрымліваюцца больш шырокімі і тонкімі — для раўнамернага абсмажвання. Калі тушка смажыцца цалкам, на скуры ўздоўж робяцца надрэзы, каб рыбіна не дэфармавалася. А каб рыба была больш сакавітай і смачнай, яе папярэдне замочваюць у малацэ і толькі перад самым смажаннем соляць, перчаць, паніруюць у муцэ.

А самае галоўнае — рыбу нельга класці на нераззагрэтую патэльню. У гэтым выпадку замаруджваецца ўтварэнне скарынкі, якая затрымлівае сок, і рыба траціць не толькі сакавітасць, але і смак, і пажыўнасць.

Кумпяк

Пры сухім саленні мяса атрымліваецца не такім смачным, але даўжэй захоўваецца. Для націрання каважаў выкарыстоўваюць наступную сумесь: 5 кг солі, 2 кг цукру, 156 г дробнай салетры (з разліку на 100 кг свініны). Праз некалькі дзён кавалкі мяса зноў націраюць такой жа колькасцю сумесі. Сярэднія і дробныя кумпякі прасольваюцца за 2—3 тыдні, буйныя — за 4—5. Затым свініну вымаюць, лішнюю соль абтрасаюць і вешаюць (як і пры саленні ў расоле) для прасушвання. **Трэба памятаць: і саленне, і прасушванне трэба ажыццяўляць у халодным месцы.** Калі свініна перасолена, не засмучайцеся. Апусціце яе ў халодную ваду і пры неабходнасці змяніце ваду некалькі разоў.

КУМПЯКІ ВАРАНА-ВЭНДЖАНЫЯ

Захоўваюцца больш працяглы час, аднак і прыгатаванне іх патрабуе больш клопату. Пасля салення мяса трэба вымачыць 2—3 гадзіны, абсушыць і вэндзіць дымам пры тэмпературы 40—45° некалькі гадзін, пасля чаго варыць ці запякаць. Калі ж трэба кумпяк захаваць на доўгі час, то тэрмін вэнджання прадаўжаюць да некалькіх сутак і нават тыдняў. Сыравэнджаныя кумпякі трэба вэндзіць у халодным дыме (каля 20—25 °С). Пасля чаго падсушваць у сухім месцы каля тыдня.

БЕЛАРУШЧЫНА

ВЕСТКІ

НАВАГРУДАК ПОМНІЦЬ СЯБЕ СТАЛІЦАЙ

Па намерах тутэйшых улад відаць, што слынны горад беларускай гісторыі мае намер развітацца з безаблічным райцэнтраўскім існаваннем. І для гэтага ёсць шмат падстаў. Адна слава былой сталіцы Вялікага княства Літоўскага чаго вартая! Сёння ў горадзе адкрываюцца другія Навагрудскія чытанні.

Акрамя таго, у гэтыя ж дні ў горадзе адкрыецца гісторыка-краязнаўчы музей і разам з літаратурным іх стане два — што ўжо зусім нечуваная рэдкасць для нашых райцэнтраў.

Скіне покрыва і новы помнік — гэта скульптурная работа Валерыя Янушкевіча, прысвечаная славутаму ўраджэнцу гэтых мясцін Адаму Міцкевічу.

ЁН СТАЎ ДЛЯ НАС БОЛЬШ БЛІЗКІМ

АГЛЯД СКАРЫНІЯНЫ

«Вера без спраў мёртвая», гаворыцца ў Бібліі. Гэтае мудрае выказванне любіў наш славуты першадрукар Францішак Скарына. Яркі прыклад дзяліката асветніка-гуманіста асабліва паказальны і важны для нас сёння. Ён пераканаўча сведчыць, як многа можа зрабіць для свайго народа адзін чалавек, дзейны, актыўны, самаахвярны.

У апошнія гады, калі наша краіна ўрачыста адзначала 500-годдзе з часу нараджэння Скарыны, ён стаў для нас яшчэ больш блізкім. У кнігарнях можна было набыць самыя розныя выданні пра вялікага асветніка: строга акадэмічныя і навукова-папулярныя, грунтоўныя фаліянты і кішэнныя, падарожныя кніжкі, календары і паштоўкі. Сучасная Скарыніяна папоўнілася больш чым дваццаю дзесяткамі асобных кніг і не адной сотняй артыкулаў. Сапраўдным падарункам для ўсіх аматараў Скарыны стала энцыклапедыя «Францыск Скарына і яго час», што была выдадзена на беларускай і рускай мовах.

Нельга не здзівіцца і не парадавацца, колькі зроблена ў апошні час па скарыназнаўству. І ў гэтым найперш вялікая заслуга вучоных. Сёлета на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Беларусі па навуцы вылучаны цыкл прац «Скарына і беларуская культура». У спісе прадстаўленых мы бачым мовазнаўца А. Булыку, які нямала зрабіў у вывучэнні старабеларускай мовы. Ён—адзін з аўтараў калектыўнай манаграфіі «Мова выданняў Скарыны», у якой грунтоўна раскрыта непаўторнае багацце мовы першадрукара.

Унікальны зборнік дакументаў і матэрыялаў падрыхтаваў літаратуразнаўца В. Дарашкевіч. У працэсе работы былі знойдзены і зусім невядомыя дакументы пра Скарыну. Гэты каштоўны зборнік цікавы і патрэбны не толькі навукоўцам, але і настаўнікам, выкладчыкам, студэнтам.

Плённа вывучае мастацкае афармленне кніг Скарыны доктар мастацтвазнаўства В. Шматаў. Ён усебакова даследаваў яго гравюры, застаўкі, ініцыялы, асабліва вядомы партрэт асветніка, прасачыў асаблівасці іх мастацкага стылю і паказаў самабытны, рэнесансава-гуманістычны характар мастацкага аздаблення кніг першадрукара. Працы В. Шматава, асабліва яго апошняя, выдадзеная ў Маскве манаграфія «Мастацтва кніг Францыска Скарыны», раскрылі ўсё багацце і непаўторнае эстэтычнае хараство скарынаўскіх выданняў як сапраўдных шэдэўраў кнігадрукавання.

Рознабаковы ўклад у выкананне Скарынаўскай праграмы, у вывучэнне творчай спадчыны Скарыны, яго эпохі і традыцый унёс вядомы даследчык беларускай старажытнай літаратуры В. Чамярыцкі. Яму належаць грунтоўныя раздзелы і артыкулы ў самых розных выданнях, ён адзін з аўтараў нарыса пра беларускага асветніка, што апублікаваны ЮНЕСКО ў Парыжы на англійскай і французскай мовах. Апрача таго, у многіх кнігах скарынаўскай серыі сустракаецца прозвішча В. Чамярыцкага і як навуковага рэдактара.

Многія, напэўна, маюць у сваіх бібліятэках кнігі вядомага маскоўскага гісторыка, даследчыка славянскага кнігадрукавання Я. Неміроўскага. Сваёй змястоўнай і грунтоўнай манаграфіяй пра Скарыну, шэрагам іншых важкіх прац ён сур'ёзна ўзбагаціў скарыназнаўства, садзейнічаў яго выхаду на еўрапейскі ўзровень. Арыгінальную і цікавую працу «Пачатае Скарынам» напісаў Ю. Лабынцаў. Уважліва разгледзеўшы багатую, разнамоўную кніжную прадукцыю друкарняў Беларусі і Літвы XV ст., ён выявіў дабратворную ролю скарынаўскіх традыцый у развіцці ўсходнеславянскага кнігадрукавання і пераканаўча паказаў перадавую ролю беларускай культуры эпохі Адраджэння ва Усходняй Еўропе, што ўплывала на культуру суседніх народаў.

Паводле палажэння аб прэміях, нельга вылучаць калектыў звыш 6 чалавек. Таму, на жаль, сярод прадстаўленых да прэміі мы не знаходзім вядомага беларускага мовазнаўца А. Жураўскага, кнігазнаўца Г. Галенчанку, гісторыка А. Каўку, уклад якіх у Скарыніяну таксама вельмі значны.

Дзякуючы карпатлівай працы беларускіх скарыназнаўцаў мы папоўнілі свае паліцы цэлай серыяй цікавых і вельмі патрэбных кніг. Да ўжо згаданых варта дадаць Поўны збор твораў Скарыны, своеасаблівую энцыклапедыю беларускай культуры XVI ст. «Скарына і яго эпоха», а таксама трохтомнае выданне яго Біблії.

Магчыма, прыдзірлівы крытык знойдзе ва ўсіх гэтых працах і праліку. Аднак у асноўным трэба прызнаць, што беларускія вучоныя ўзнялі сваімі даследаваннямі скарыназнаўства на новы, больш высокі ўзровень. Дзякуючы іх намаганням мы глыбей спазналі, якую каштоўную спадчыну маем, а таксама адчулі, наколькі яна актуальная і патрэбная нам сёння як стымул нашага ціпяпашняга Адраджэння. Таму, здаецца, не можа быць ніякага сумнення ў тым, што цыкл «Скарына і беларуская культура» безумоўна заслугоўвае Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

Галіна ФАТЫХАВА.

ШТОДЗЁННЫЯ СІТУАЦЫІ

Ці ўсміхнецца мне касір?

На прынцыповае пытанне Уладзіміра Малашчанкі: «Чаму ў Мазыры беларусу грошай не даваді?» (гл. «Беларушчыну» за 26 чэрвеня) адказаў начальнік упраўлення зберажэнняў і каштоўных папер Беларускага ашчаднага банка Аляксандр Баркун. У сваім лісце ў рэдакцыю ён паведаміў, што ў вобласці накіраваны пісьмы з патрабаваннем строга выконваць Закон аб мовах. Касіры-кантралёры, якія адмовяцца прымаць запоўненыя па-беларуску дакументы, будуць несці персанальную адказнасць.

Дзелавая рэакцыя, але ад усяго гэтага сумнавата. Закон, выходзіць, без службовых інструкцый і не закон.

«Правильно пишите адрес»

Я ўжо даўно знаёмы са старшынёй Беларускай сялянскай партыі Яўгенам Лугіным. Сустрэліся мы з ім і тады, калі Лугін прыязджаў у Асіповічы для падрыхтоўкі раённай канферэнцыі Беларускай сялянскай партыі. І ён паказаў мне пісьмо — звычайны канверт з «настаўніцкай» паметкай: «Правильно пишите адрес...» Але памылак у адрасе не было. Проста Лугін напісаў яго па-беларуску.

Мне цяжка вызначыць, мінскія ці асіповіцкія сувязісты зрабілі такую дзіўную адзнаку на канверце, але факт застаецца фактам: пошта яшчэ, відаць, доўга збіраецца працаваць па старых правілах. І цяпер я не здзіўляюся таму, што мне не так даўно вярнулася пісьмо, якое я накіраваў у рэдакцыю адной з газет. Шарыкавай ручкай на адрасе атрымальніка быў пастаўлены чырвоны крыж. Вось так!

Іван СЦЯПУРА.
г. Асіповічы.

Подых даўніх гадоў

На ціхай старажытнай вулачцы Полацка размясціўся музей, роўных якому няма не толькі ў блізкім, але і ў далёкім замежжы.

Экспазіцыя расказвае пра гісторыю беларускага кнігадрукавання, якое мае сваю прыкметную старонку ў гісторыі сусветнай культуры. Тут можна ўбачыць шмат цікавых матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці вядомых асветнікаў — святой Ефрасінні Полацкай і Францыска Скарыны.

Два невялікія пакоі дакладна перадаюць абстаноўку тых памяшканняў, дзе насельнікі манастыроў перапісвалі царкоўную літаратуру, любоўна ўпрыгожвалі і пераплятали.

НА ЗДЫМКАХ: тут размешчаны музей; з далёкіх стагоддзяў захаваліся гэтыя старажытныя выданні; фрагмент манаскай келлі, дзе перапісваліся царкоўныя кнігі.

Яўген ПЯСЕЦКІ.



ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

Гарбар, грабар, рымар...

Мікалай Язэпавіч Лазар з Маладзечна ў свой час працаваў наборшчыкам у друкарні. Але адолелі хваробы — згубіўся слых, амаль перасталі дзейнічаць ногі... Уцехай яго жыцця стаў крыху незвычайны для пенсіянера занятак — ён пачаў сістэматызаваць усе фальклорныя і этнаграфічныя звесткі, якія накапіў за доўгія гады. Склаў картатэку ўжывальных на Беларусі мужчынскіх і жаночых імёнаў, запісваў частушкі, паданні, народныя вершы... І, як гэта часта здараецца, плён працы энтузіяста бясследна знік: прыехалі калегі-журналісты з Беларускага тэлебачання — узялі інтэрв'ю, а заадно прыхапілі і картатэку імёнаў. Дзе, у каго яна,— Мікалай Язэпавіч не ведае і не зможа, на жаль, ні аднавіць яе, ні паехаць шукаць...

Увогуле, сістэматызацыя і абагульненне матэрыялаў, сабраных аматарамі-краязнаўцамі,— праблема і праблема. Няма ў іх свайго часопіса, толькі нядаўна адноўлена таварыства.

Таму мы прапануем усім, хто мае цікавыя матэрыялы, можа падзяліцца сваімі ўспамінамі, запісамі,— старонкі «Беларушчыны». А сёння друкуем фрагменты нататкаў аб назвах прафесій, дасланых М. Лазарам. Яны падкажуць, чаму адна з вуліц у Мінску яшчэ называецца Рымарнай, расшыфруюць паходжанне многіх прозвішчаў, назваў вёсак.

ГАРБАР. Спецыяліст, які вырабляў шкуры хатняй жывёлы — каровіны, валовыя, бычыныя, конскія, авечыя, казлініы, а таксама дзікіх жывёл — аленяў, ласёў, ваўкоў, лісаў, мядзведзяў і іншыя. Для гэтай работы трэба шмат прылад, напрыклад, вялікія ліпавыя чаны, дубовая кара, жытняя мука. Работа цягнулася доўга, месяцамі, была цяжкай, малапрывабнай. Гарбаром, дарэчы, пачынаў працаваць пісьменнік, першы старшыня беларускага ўрада Цішка Гартны (Жылуновіч). Мяркую, што слова «гарбар» звязана з тым, што найлепшая пасля вырабу скура атрымлівалася з гарба жывёлы.

КУШНЕР. Гэта сумежная спецыяльнасць. Чалавек вырабляў драбнейшыя скуркі: трусоў, зайцоў, тхароў, барсукоў, кратоў і нават вялікіх пацукоў. З іх шылі футры, шапкі, рукавіцы, вельмі выгадныя і цёплыя «паддзёўкі».

ШАПАВАЛ. Той, хто вырабляў з воўны валёнкі, шапкі-папахі. Іх добрая якасць залежала ад таго, наколькі добра вымытая і прачэсаная воўна. Потым яна выбівалася таўкачамі ў драўляных ступах спецыяльнай формы.

ГРАБАР — гэта далакоп. Людзі гэтай спецыяльнасці замянялі сучасныя пахавальныя бюро: рабілі дамавіны, капалі дол. Як правіла, яны працавалі не па адным, сама меней — удваіх.

РЫМАР (па-руску шорник) — той, хто вырабляў вупраж для язды на конях, валах, быках, сабаках. А для таго, каб запрэгчы каня ў аглобліі, былі патрэбны і аброць, і хамут, і сядло, і падсядзёлак, і лейцы, і шмат больш дробных дэталяў. Рымарствам, як і гарбарствам, займаліся ў асноўным яўрэі, вядома, толькі мужчыны. Жанчыны і падлеткі маглі толькі падсабляць ім.

МОВА ДАРОГ

Эх, двухмоўе...

Гэтыя здымкі даслаў у рэдакцыю наш чытач са Скідаля Ілья Барысаў. Такія ўказальнікі сустракаюць нас на дарогах Беларусі і Літвы. Нагадаем, што ў выпуску за 12 чэрвеня мы ўжо пісалі пра намеры дарожных службаў рэспублікі надалей надпісы на ўнутраных дарогах рабіць толькі па-беларуску, на міжнародных—па-беларуску і па-англійску. А пакуль на гэта знойдуцца сродкі, на вочы зноў і зноў будуць трапляць гэтыя іранічныя двухмоўныя рэлікты. Зрэшты, у іх нават першапачаткова не закладвалася ніякай мэтазгоднасці, акрамя відавочнага жадання дагадзіць «и» вашым, «і» нашым.

РАДАВОД

Хачу ўсё ведаць пра сваё прозвішча

Паважаная «Беларушчына»!

Мае продкі нарадзіліся і жывуць на поўначы Беларусі ў Верхнядзвінскім (Дрысенскім) раёне Віцебскай вобласці. Іх прозвішча было Шатаронак, але пасля смерці дзеда прозвішча змянілася да непазнавальнасці і цяпер стала «Шайцерёнок». Можа б вы мне растлумачылі, ад якога слова яно паходзіць, што азначае і як правільна пішацца.

Валянціна ШЭЛЕГ.
г. Наваполацк.

Мяне вельмі зацікавіў адказ на ліст Руслана Равікі пра яго прозвішча. Я таксама хачу ведаць, як правільна трэба пісаць маё прозвішча: Пачабут, Пачабут, альбо (як гэта пішуць на рускай мове) Почебут. Мне гэта яшчэ і таму цікава, што жыву я ў Калінінградскай вобласці, жонка ў мяне руская. Каб не выпісваў вашу газету, дык і зусім забыў бы родную мову. Дапамажыце расказаць дзецям, хто іх продкі. І ў цэлым, у мяне ёсць прапанова зрабіць гэту паслугу платнай, і я гатовы заплаціць за яе стольні, колькі спатрэбіцца.

Ю. ПАЧАБУТ.
г. Гусеў Калінінградская вобл.

А чаму б нам і не прыняць разумную прапанову спадара Пачабута? Паходжанне свайго прозвішча, напэўна, захочуць ведаць усе нашы чытачы. Таму мы дамовіліся з вучонымі Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа друкаваць у нашай рубрыцы такія даведачныя матэрыялы, з якіх можна будзе скласці маленькі слоўнічак. А плату нашым чытачам мы прапануем невялікую — яка, будзем лічыць, закладзена ў падпісную цану на «Звязду».

Сёння чытачам адказвае кандыдат філалагічных навук Ганна УСЦІНОВІЧ.

Перш за ўсё трэба адзначыць, што пісьмовая практыка заўсёды павінна ўлічваць устойлівасць і традыцыйную дакладнасць прозвішчаў, характэрную прыкмету гэтай антрапанімічнай катэгорыі. Менавіта гэта асаблівасць звязвае і аб'ядноўвае розныя пакаленні нашчадкаў аднаго роду. Таму разнабой у афіцыяльным напісанні аднаго і таго ж прозвішча парушае радавое адзінства, якое склалася на працягу стагоддзяў, і, зразумела, з'яўляецца непажаданай і недапушчальнай з'явай.

Што ж да паходжання прозвішча Шатаронак, то яно ўзыходзіць, як сцвярджае акадэмік М. В. Бірыла ў сваёй вядомай працы «Беларуская антрапанімія» (Мінск, 1969, с. 470) ад цюркскага слова **шатыр**, якое азначае «слуга, скараход, які ідзе перад выхадам цара ці вяльможы».

А вось прозвішча Шайтаронак звязваецца з уласным імем **Шайтар**, вядомым з XVII—XVIII стагоддзяў. Значыць, прозвішчы Шатаронак і Шайтаронак маюць розную выходную аснову і таму замяняць іх адно другім няма падстаў.

М. В. Бірыла ў сваёй вышэйпамянёнай працы (гл. с. 319) прыводзіць прозвішчы Пачабут, Пачыбут, Пачабыт, што звязаны з антрапонімамі Пачабут, Пачабыт, паходжанне і значэнне якіх зацемнены і пакуль не ўстаноўлены. Як жа правільна пісаць прозвішча па-беларуску? Калі яно вымаўляецца традыцыйна, з націскам на апошнім складзе, то «Пачабут», а калі на другім (што можна тлумачыць уплывам польскай мовы) — то «Пачэ́бут».

Парады на ўсякі выпадак



Яшчэ адзін спосаб замазвання шчылін у падлозе з дошак. Для гэтай мэты выкарыстоўваюць бітум. Яго трэба распляві́ць і заліць у шчыліну, лішкі зрэзаць. Потым шчыліну зафарбаваць, фарба злёгку растворыць застылы бітум. Яшчэ раз пафарбуйце — і след рамонту знікне.

Гэты рэцэпт стары, але дакладны. Тонкі слой мыла, які наносяць на паверхню шкельцаў акуляраў (з абодвух бакоў), праціраюць насуха мяккай анучкай. Акуляры перастаюць пацець у халоднае надвор'е.

Шарсцяныя шкарпэткі ў гумавых ботах ірвуцца вельмі хутка. Каб падоўжыць тэрмін іх службы, падшыйце да падэшвы шкарпэтак капронавы падследнік ці частку капронавай панчохі.



Распілоўваючы нажоўкай тонкую металічную трубку, змясціце яе ў паз драўлянага бруска (напрыклад, у паз паркетнай клёпкі) — канцы трубкі не скамечацца.

«Агучыць» чайнік можна самому. Са старой гумавай цацкі выцягніце свістульку, прасвідруйце ў накрыўцы чайніка дзірку і завальцуйце туды свістульку на гумавых пракладках. У момант закіпання «вартаўнік» пакліча вас на кухню.



Тонкая гумавая лата пры намазванні яе клеем скручваецца ў трубку. Да вонкавага боку загадзя прыляпіце палоскі лейкапластыра, якія потым лёгка здымаюцца.

Шкляныя слоікі і накрыўкі ад кансерваў венгерскай вытворчасці можна выкарыстоўваць некалькі разоў для хатняга кансервавання. Слоік закрываюць накрыўкай з пракладкай, прыціскаюць грузам і ставяць у бак для пастэрызацыі. Пасля апрацоўкі яму даюць астыць пад грузам, накрыўка будзе трымацца надзейна.

Калі гумавы бот прапускае ваду, а вы не можаце знайсці дзірку, сплюшчыце халяву, закруціце і апусціце ніз бота ў ваду. Бурбалкі з бота дапамогуць знайсці пракол ці шчыліну.

***

Аўтааматару карысна мець прасцейшы пробнік на 6—12 вольт. З яго дапамогай лёгка адшукаць няспраўнасць у ланцугу асвятлення, генератары, рэле і г. д. Зрабіць яго няцяжка. У корпус старой аўтаручкі ўстаўце лямпачку на патрэбнае напружанне. Да яе загадзя прыпаяйце правады. Адзін ад лямпачкі прымацуйце да шчупа, другі (доўгі) — да зацісканчкі тыпу «кракадзіл». Для праверкі напружання «кракадзіл» мацуюць на корпусе, а шчуп прыкладаюць да провада, які патрэбна праверыць. Лямпачка гарыць — ланцуг спраўны.



Варэнне без слоікаў

Чым замяніць дэфіцытную шклатару ў перыяд нарыхтовак ягад на зіму? Паспрабуйце выкарыстаць поліэтыленавыя пакеты. Вазьміце два пакеты, укладзіце адзін у другі, а потым змясціце ў мяшочак са шчыльнай тканіны ці пластыку, па памеры крыху меншы за поліэтыленавы пакет. Пры запаўненні варэннем мяшочак з тканіны ці пластыку не дасць расцягвацца пакетам, і іх герметычнасць будзе забяспечана.

Надзейная ізаляцыя

У садовым доме з электраправодкай патрэбна абыходзіцца асабліва асцярожна, пастаянна кантралюючы надзейнасць ізаляцыі правадоў. Звычайна на месца іх злучэння накладваюць ізаляцыйную стужку. Калі яна зроблена з пластыку, то яе можна акуратна, каб не пашкодзіць праводку, злёгку расплавіць паяльнікам. Маналітны слой, які ўтвараецца пры гэтым, надзейна ізалюе жылы правадоў.

Дапаможа трафарэт

Лета —самы падыходзячы час для рамонту садовага дома. Найбольш слабае яго месца — падлога з дошак, бо дошкі патрабуюць пастаяннага догляду, а перыядычна — дробнага рамонту, напрыклад, замазвання шчылін, якія часта ўтвараюцца ў драўлянай падлозе. Каб аблегчыць гэту марудную работу, прапануем няхітрае прыстасаванне — трафарэт. Гэта кавалачак шчыльнай папёры, пластыку, кардону з вузкай адтулінай у сярэдзіне. Намазваючы на трафарэт шпаклёўку, акуратна запаўняем шчыліны падлогі.

Замест кастра—цэгла

Для першапраходцаў-садаводаў, якія толькі атрымалі доўгачаканы ўчастак, на першым часе касцёр замяняе печ і пліту. На кастры гатуюць, каля яго сушаць адзенне. Але для яго патрэбны дровы, якія не заўсёды ёсць на ўчастку. Там, дзе дроў не хапае, можа выручыць звычайная цэгла. Яе прасушваюць, а затым на некалькі гадзін апускаюць у газу. Насычаную ёю цэглу падпальваюць, і своеасаблівы прымус гатоў. Каб патушыць полымя, цэглу накрываюць брызентам.

РЭЗЕРВЫ МЫЙКІ

Знізу—кладоўка

Сучасная кухонная мэбля, што выпускаецца прамысловасцю, разлічана на кватэры палепшанай планіроўкі, дзе плошча кухні ад 8 да 12 м². У маленькую кватэру з кухняй 5 м² такія гарнітуры проста не змяшчаюцца. Таму даводзіцца абсталёўваць яе асобнымі прадметамі ці рабіць мэблю самастойна.



І паколькі ў невялікім памяшканні практычна няма месца, каб зрабіць шафы і кладоўкі, можна выкарыстаць ніжнюю частку мыйкі для захоўвання агародніны.

Уся канструкцыя сабрана з лістоў драўніннастружкавых пліт (ДСП), абклееных пластыкам, падабраным у адпаведнасці з астатняй мэбляй кухні.

Спачатку вырабляем асноўны каркас. Ён складаецца з дзвюх бакавін, злучаных паліцай і перагародкай. Апошняя служыць элементам цвёрдасці ўсёй канструкцыі, таму што задняя сценка, якая ўмацоўвае ўсе традыцыйныя канструкцыі, у мыйцы адсутнічае. У адной з бакавых сценак, а таксама ў паліцы неабходна выразаць вокны пад каналізацыйныя трубы (на чарцяжах гэтыя праёмы не паказаны, іх форма, размеры і месца выбіраюцца на месцы). У верхняй частцы бакавіны звязаны верхняй дошкай, якая мае выраз на ніжняй частцы ракавіны. Да левай бакавіны на спецыяльных мэблевых петлях мацуюцца дзверцы.

У ніжняй частцы мыйкі размяшчаецца адкатная скрыня для агародніны. Канструкцыя яе вельмі простая, збіраецца з ДСП таўшчынёй 15 мм. Бакавыя сценкі маюць адтуліны для вентыляцыі. Кольцы, размешчаныя ўнізе скрыні, можна вытачыць з дрэва, тэксталіту ці выкарыстаць гатовыя мэблевыя, што выпускаюцца прамысловасцю.

ВОЗГАЛАС РОЗГАЛАС

«ЗАЛАТОЕ» ВЕТА

Не так даўно Савет Міністраў РБ прыняў пастанову «Аб зацвярджэнні правіл аб здзелках з каштоўнымі металамі і камянямі». Многія грамадзяне аказаліся непадрыхтаванымі да такога рашэння і таму разгубіліся. Што ім рабіць з каштоўнасцямі, якія засталіся, напрыклад, у спадчыну і на што распаўсюджваецца пастанова Саўміна?

Згодна з ёю, да каштоўных металаў, з якімі забаронены ўсялякія аперацыі, адносяцца золата, серабро, плаціна і металы плацінавай групы (іридый, родый, паладый, рутэній, осмій), дэталі з іх, а таксама каштоўныя манеты. Да каштоўных камянёў адносяцца алмазы, брыльянты, рубіны, ізумруды, сапфіры і жэмчуг, незалежна ад іх стану: сыры камень ці апрацаваны. Незабароненымі да здзелак застаюцца ювелірныя і бытавыя вырабы з каштоўных металаў і камянёў, лом такіх вырабаў і манеты з каштоўных металаў, якія знаходзяцца ў абарачэнні на тэрыторыі РБ, а таксама дыскі з каштоўных металаў для зубапратэзіравання і сусальнае золата. Права ўсіх аперацый у Беларусі па куплі і продажу каштоўных металаў і камянёў належыць выключна Нацыянальнаму банку.

Дазваляецца падарунак з каштоўных металаў і камянёў, які не перавышае суму пяці мінімальных зарплат. А калі перавышае, то належыць абавязковаму натарыяльнаму засведчанню.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

КДБ НЕ ДРЭМЛЕ...

У Оршы супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і КДБ па Віцебскай вобласці затрымана група, якая з пачатку года займалася вырабам рэвальвераў. Усяго было зроблена 17 штук, 4 з іх паспелі збыць, астатнія ж, а таксама 4 пнеўматычныя пісталеты з 18 пачкамі патронаў, канфіскаваны. Следства цяпер высвятляе, якую асаду збіраліся вытрымліваць аршанцы з такім арсеналам.

З 92-м у 1992 — туга

З БЕНЗІНАМ ЗНОЎ ТУГАВАТА, ХОЦЬ І РАЗМЯРКОЎВАЕЦЦА ЁН СТРОГА ПА ПАЛІЎНЫХ КАРТКАХ.

Асабліва гэта адчуваюць уласнікі, у якіх аўтамабіль працуе на АІ-92. Днямі ў Мінск, напрыклад, пры заяўцы ў 778 тон на суткі паступіла ўсяго 50. Ён будзе «раздадзены» толькі па прызначэнню — спецмашынам «хуткай дапамогі», аўтамабілям для перавозкі хлеба. Шэсць тон такога паліва будзе адпушчана пенсіянерам, у якіх адзіны сродак перамяшчэння—аўтамабіль. Учора ж пры заяўцы ў 1.000 тон завезлі толькі 150 тон.

ЦІ БЫЛІ АДРЭЗАНЫЯ ГАЛОВЫ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

рэшткі паражоных органаў, тампоны, бінты, упакоўкі з-пад лекаў. Была адна рука. Вось, убачыўшы гэту руку, мясцовыя жыхары і пазванілі ў міліцыю, а тыя — нам. На месца адразу выехала вялікая група, чалавек 20 — работнікі пракуратуры, судмедэксперты. Як высветлілася — дарэмна. Злачынства там не было, а была звычайная службовая халатнасць супрацоўнікаў НДІ анкалогіі.

Справа ў тым, што ўвесь пасляаперацыйны матэрыял павінен спальвацца ў спецыяльнай печы, але на той момант печ ужо загасілі. Таму даручылі двум рабочым дзе-небудзь на тэрыторыі інстытута закапаць гэтыя пакеты. За выкананнем загаду ніхто не прасачыў, і рабочыя «аблегчылі» сваю справу, проста выкінуўшы пакеты ў лес. Саставу злачынства мы тут не знайшлі.

— Значыць, ім нічога за гэта не будзе?

— Мы напісалі прадстаўленне ў НДІ, вінаватыя ўжо пакараны.

— А што на гэты конт сказалі санітарныя службы?

— Небяспекі заражэння мясцовасці не было. Але выпадак, канешне, дзікі! Першы такі на маёй практыцы. Чалавечыя рэшткі, вядома, час ад часу знаходзяць. Але каб з медыцынскай установы! Будзем спадзявацца, што больш такога не паўторыцца.

Кар. «Звязды».

«Рукі ўрада звязаны законамі...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

збожжа і кармоў. Невыпадкова, што ў зваротах насельніцтва да ўрада рэспублікі пастаянна гаворыцца аб неабходнасці ўзмацнення мер супраць карупцыі, безгаспадарчасці. У Магілёўскай вобласці, напрыклад, у 1991 годзе ва ўчыненні злачынстваў удзельнічалі 34 кіраўнікі розных рангаў, а за 7 месяцаў сёлетняга года да крымінальнай адказнасці прыцягнута 26 кіраўнікоў. Выяўлена 25 фактаў хабарніцтва. У Гродзенскай вобласці за паўгода за ўтойванне прыбытку прадпрыемствамі і арганізацыямі да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 320 службовых асоб, з вінаватых спагнана больш чым 700 тысяч рублёў штрафаў. Што робяць у такой сувязі выканкомы мясцовых Саветаў? А яны проста назіраюць. Вось прыклады. Маладзечанская міжрайпракуратура абвінавачвае старшыню райспажыўсаюза Пальчэўскую ў крадзяжах грошай, шматразовых парушэннях правіл гандлю з мэтай асабістай нажывы, а на сесіях райсавета не даецца згоды на прыцягнення старшыні-дэпутата да крымінальнай адказнасці.

Трэба адзначыць, што асаблівы ўсплёск злоўжываванняў звязаны з утварэннем і дзейнасцю камерцыйных структур. Нядобрасумленную ролю часта адыгрываюць тут высокапастаўленыя асобы. Намеснік міністра рэсурсаў Беларусі Цыганкоў выдаў ліцэнзію камерцыйнаму цэнтру «Гроднаапткандаль» на вываз 100 тон масла і вялікай колькасці тытунёвых вырабаў у Азербайджан без указання колькасці апошняга віду прадукцыі і адраса атрымальніка. У выніку ж туды было адпраўлена незаконна 70 тысяч пачкаў цыгарэт «Космас». Паспрабуйце знайсці сёння гэты ж «Космас» у Беларусі. Асобныя кіраўнікі даюць згоду на правядзенне бартэрных аперацый на кабальных для нас умовах. Са згоды, напрыклад, намесніка старшыні Дзяржжамнафтапрадукта Заранка аднаму з прыватных латвійскіх прадпрыемстваў выдадзена ліцэнзія на пастаўку туды 250 тон дызельнага паліва, 50 тон бензіну, такой жа колькасці машыннага масла. Усё гэта — за паўтоны пчалінага мёду і 1 тону вэнджаных каўбас.

Ідзе негалосны працэс зрастання камерцыйных структур з прадстаўнікамі дзяржаўных і гаспадарчых органаў. Першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкома Яскевіч, які адначасова з'яўляецца старшынёй савета заснавальнікаў фірмы «Магілёўагразнешгандаль», падпісваў распараджэнні на водпуск гэтай фірме соцень тон прадуктаў харчавання, якіх так не хапае насельніцтву вобласці. Прыклады ўдзелу службовых асоб у камерцыйных структурах не адзінкавыя: з 16 структур, зарэгістраваных Мінскім гарвыканкомам, у 4 інтарэсы гарвыканкома прадстаўляе яго старшыня А. Герасіменка, у васьмі—намеснікі старшыні Нікіценка, Сасноў і іншыя. Праверкай высветлена, што дзейнасць створаных пры Мінгарвыканкоме малых, арэндных прадпрыемстваў на развіццё гарадской гаспадаркі аказвае вельмі нязначны эфект, больш таго, яны выкарыстоўваюць вытворчую і матэрыяльна-тэхнічную базу заснавальнікаў, бюджэтныя сродкі горада, а, скажам, галоўны аб'ём будаўнічых работ выконваюць за межамі Мінска — там, дзе больш даходна. Вось, напрыклад, МП «Эльвіра» на аб'ектах горада ў 1991 годзе асвоіла ўсяго 1,2 працэнта сродкаў ад усяго аб'ёму выкананых работ.

Падобных прыкладаў у дакладзе было прыведзена многа. Канстатацыя фактаў заняла шмат часу. Але ці ж гэта галоўнае? Кіруючыя работнікі крытыкуюцца сёння на ўсіх узроўнях, эфект жа ад гэтага — нулявы. Рукі ўрада, як адзначыў В. Кебіч, звязаны законамі. У яго няма ніякай магчымасці спыніць хапугу, хабарніка, злодзея. Нават прыціснутага фактамі. На іх абарону ўзнімаюцца Саветы (бо пераважная большасць кіраўнікоў — дэпутаты), пракуратура. Старшыня Гомельскага аблвыканкома, напрыклад, скардзіўся, што нічога не можа зрабіць супраць злачыннай дзейнасці старшыні аднаго з сельскіх Саветаў, якая прывяла да знішчэння пажарам вялікага лясного масіву — зняць яго з пасады можа толькі мясцовы Савет, а распараджэнне абласных улад носіць рэкамендацыйны характар. І тым не менш, падкрэслівалася думка, з бязвольнасцю выканаўчых структур улады трэба канчаць неадкладна. Інакш далейшае спаўзанне да хаосу непазбежнае. У поўнай меры неабходна выкарыстоўваць і існуючае заканадаўства, і распрацоўваць новае. Народ цярпець не хоча.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

У ГОРАДЗЕ СТАНЕ БОЛЬШ СПАКОЙНА

Рота асобага назначэння створана ў Мінску. Яе мэта — падтрыманне дысцыпліны сярод ваеннаслужачых, якія знаходзяцца ў звальненні ў горадзе, садзеянне органам міліцыі ў затрыманні асабліва небяспечных злачынцаў, а таксама аказанне ўсялякай дапамогі ў час стыхійных бедстваў.

У роце — ваеннаслужачыя тэрміновай службы, якія прайшлі падрыхтоўку ў паветрана-дэсантных войсках. Яны нясуць патрульную службу разам з работнікамі міліцыі.

Такія роты для падтрымання парадку мяркуецца стварыць ва ўсіх абласных цэнтрах рэспублікі.

НА ЗДЫМКУ: перад заступленнем на дзяжурства.

Фота Валерыя АЛЯШКЕВІЧА. (БЕЛІНФАРМ).

ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ

14 верасня, ПАНЯДЗЕЛАК

Беларускае тэлебачанне

16.30. Навіны.
16.35. Беларуская літаратура. 5-ы клас. У свеце казкі.
17.00. «Гэй, гэй, «Таўкачыкі!» Выступленне дзіцячага фальклорнага калектыву Смаленскай школы Віцебскай вобласці.
17.40. Мультфільмы.
18.00. Дак. фільм.
18.15. Абласныя навіны (Брэст).
18.25. Свята футбола, прысвечанае 10-гадоваму юбілею перамогі мінскага «Дынамо» ў чэмпіянаце СССР. «Дынамо-82» — зборная Беларусі.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Вобраз». Літаратурны часопіс.
22.30. Спартыўны тэлекур'ер.
22.50. НІКа.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. Мультфільм.
8.00. Навіны.
8.20. «Атэль «Ля загінуўшага альпініста». Маст. фільм.
9.40. Брэйк-рынг.
10.40. «Калі медзведзяня прачнецца». Мультфільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Марафон-15».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.15. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.05. Асацыяцыя дзіцячага тэлебачання. «Хачу стаць зоркай».
16.45. Адпачывай.
17.00. Навіны.
17.20. Футбольны агляд.
17.50. НЭП.
18.15. «Снежная краіна». Маст. фільм (Японія).
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Прэзентацыя фільмаў рэжысёра А. Вайды.
21.05. «Новая студыя» прадстаўляе. «Дзень добры!»
21.45. Бамонд.
22.00. Аднак.
22.15. Крывы эфір.
22.30. «Глядзіце, хто прыйшоў!»
23.00. Навіны.
23.20. Джэм-сейшн.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Панове-таварышы.
8.10. Вольны час. «Дай лапу, сябар!»
8.25. Панарама прыватызацыі.
9.10. Тэатральны раз'езд. «Жыў-быў тэатр».
10.05. Канцэрт духоўнай рок-музыкі.
10.55. «Інтэрвенцыя». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Адкрыты чэмпіянат ЗША па тэнісу.
16.55. Там-там-навіны.
17.10. «Душа спявае».
17.40. Бельгія: парламент і прэса.
18.15. Даванце разбяромся.
18.25. Вялікае кола.
18.45. Крымінальные паведамленні.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Граф Монтэ-Крыста». Маст. фільм (Францыя — Германія — Італія). 1-я серыя.
21.00. Момант ісціны. С. Фёдараў адказвае на пытанні А. Каравулава.
22.00. Весткі.
22.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
22.50. Манера.
23.20. Рок-кафэ.

15 верасня, АЎТОРАК

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Ківанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 5-ы клас. У свеце казкі.
9.25. «Ойча наш». Мастацкі фільм.
15.25. «Плач перапёлкі». Маст. фільм. 1-я серыя.
16.30. Навіны.
16.35. Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 9-ы клас. Вяртанне блукаючай зоркі (Мікола Гусоўскі і яго паэма «Песня пра Зубра»).
17.05. «Родная школа мая». СШ № 166 г. Мінска.
17.35. Мультфільмы.
18.00. Дак. фільмы «Пачарпні з роднай крыніцы», «Неправінцыяльная правінцыя».
19.00. Абласныя навіны (Віцебск).
19.10. «Хвілін прыемных сустрэч». Фільм-канцэрт.
19.35. Эканамічная хваля. Праблемы развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі. Прамая лінія.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «Нядзеля за горадам». Маст. фільм (Францыя).
23.05. НІКа.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. «Капрызны Мурад». Мультфільм.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць». Мультфільм.
9.05. У свеце жывёл (з сурдаперакладам).
9.45. Асацыяцыя дзіцячага тэлебачання. «Хачу стаць зоркай».
10.25. Футбольны агляд.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Дождж у чужым горадзе». Маст. фільм. 1-я серыя.
12.30. «Абуза». Кароткаметражны фільм.
13.00. «Безыменны замак». Маст. фільм (Венгрыя). 1-я серыя.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Дзелавы веснік.
14.35. Свет грошай Адама Сміта.
15.05. Блакнот.
15.10. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.00. «440 герц». Музычная праграма для падлеткаў.
16.40. Дак. фільм.
17.00. Навіны.
17.25. Канцэрт традыцыйнай японскай музыкі.
18.05. «Як неслі стол». Мультфільм.
18.15. «Багатыя таксама плачуць».
19.00. Тэма.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Фільмы рэжысёра А. Вайды. «Канал».
22.15. Ваенная рэвю.
22.45. «Праклятая кніга». Мультфільм для дарослых.
23.00. Навіны.
23.20. Аўтаралі «Парыж—Масква—Пекін».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
7.50. Момант ісціны. С. Фёдараў адказвае на пытанні А. Каравулава.
8.45. Мульці-пульці. «Сунічны дожджык».
8.55. Кола агляду.
9.55. Кінограф.
10.30. Конкурс бальных танцаў. Лацінамерыканская праграма.
11.10. «Граф Монтэ-Крыста». Маст. фільм (Францыя—Германія—Італія). 1-я серыя.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. «Вадабокі». Праграма для дашкольнікаў (Францыя).
15.50. Студыя «Рост». «Хіт-дзённік».
16.15. Мульці-пульці. «Хто расказа небыліцу».
16.25. Там-там навіны.
16.40. Традыцыйнае карэйскае вяселле.
17.00. Майстэрня музыкі. Перадача 1-я.
17.35. Правілы гульні.
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Пецярбургскі міф. «Дальтанічны міраж». І. Севяранін.
18.40. Сам-насам з усімі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Граф Монтэ-Крыста». Маст. фільм. 2-я серыя.
21.00. Візіт прэзідэнта Расіі Б. М. Ельцына ў Японію.
21.30. Балет Санкт-Пецярбурга. З. Шасон. «Бэзавы сад».
22.00. Весткі.
22.20. Спартыўная карусель.
22.25. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
22.55. Песні Віктара Рэзнікава.

16 верасня, СЕРАДА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Дак. фільм.
9.00. Беларуская літаратура. 9-ы клас.
9.30. «Вобраз». Літаратурны часопіс.
10.30. «Чужы выпадак». Маст. фільм.
15.20. «Плач перапёлкі». Маст. фільм. 2-я серыя.
16.30. Навіны.
16.35. «Варвара-краса, Доўгая Каса». Маст. фільм.
18.00. Дак. фільмы.
19.00. Абласныя навіны (Гомель).
19.10. Роднае слова. Тэлечасопіс.
19.50. «Цэнтразап» прапануе супрацоўніцтва.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Ахоўныя афарбоўкі». Маст. фільм (Польшча).
23.10. НІКа.
23.25. Конны спорт. Міжнародныя спаборніцтвы па канкуру на прыз Беларускай асацыяцыі па конегадоўлі.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. «Крэм-бруле». Мультфільм.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. «Дзюймовачка». Мультфільм.
10.20. «440 герц». Музычная праграма для падлеткаў.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Дождж у чужым горадзе». Маст. фільм. 2-я серыя.
12.25. «Госць». Кароткаметражны фільм.
12.55. «Безыменны замак». Маст. фільм. 2-я серыя.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Тэлемікст.
15.10. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.00. Праграма тэлебачання Японіі. «Гісторыя аўтамабільнай прамысловасці Японіі».
17.00. Навіны.
17.25. ...Да 16 і старэйшым.
18.05. «Багатыя таксама плачуць».
18.50. Дак. фільм.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Хіт-парад «Астанкіна».
21.55. Аўтаралі «Парыж — Масква — Пекін».
22.20. Чорная скрыня.
23.00. Навіны.
23.20. Лімпапо.
23.50. Любімыя песні.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
7.50. Кіпрас Мажэйка. «Рэпартажы з НАТО».
8.20. Вольны час. «Дамашняе кола».
8.35. Майстэрня музыкі. Перадача 1-я.
9.10. Здабытак рэспублікі. Наш Маціс.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Бізнес — новыя імёны.
15.15. «Гара Сарак».
15.35. Там-там навіны.
15.50. Далёкі Усход.
16.35. М-трэст.
16.50. Хрысціянская праграма «Надзея сёння».
17.35. Апазіцыя.
18.15. Паўднёвая Карэя. З мінулага ў будучыню.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Граф Монтэ-Крыста». Маст. фільм. 3-я серыя.
21.00. Футбол. Кубак УЕФА. «Дынамо» (Кіеў) — «Рапід» (Вена). 2-рі тайм.
22.00. Весткі.
22.20. Давайце разбяромся.
22.30. Да вынікаў візіту Прэзідэнта Расіі Б. М. Ельцына ў Японію.
22.45. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
23.15. Экзотыка.

17 верасня, ЧАЦВЕР

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Ахоўныя афарбоўкі». Мастацкі фільм (Польшча).
15.20. На атрыманне Дзяржаўнай прэміі Беларусі. «Плач перапёлкі». Мастацкі фільм. 3-я серыя.
16.30. Навіны.
16.35. Беларуская літаратура. 10-ы клас.
17.15. «Дудка-весялушка», «Лясныя казкі». Мультфільмы.
17.40. «Цёплы дом». Пра сямейны дзіцячы дом у вёсцы Халап'я Іванцевіцкага раёна.
18.00. Дак. фільмы.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. Як пачаць уласную справу. Дыялог амерыканскіх бізнесменаў.
19.45. Бізнес-клуб «Партнёр». Выйсце з крызісу ёсць. Роздум спецыялістаў навукова-эканамічнага цэнтра «Экон». Перадача 1-я.
20.15. Тыдзень беларускага ўрада. Інтэрв'ю старшыні Гомельскага абласнога Савета народных дэпутатаў М. Р. Вайцянкова.
7.50. «Фядорына гора». Мультфільм.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Спорт. «Формула».
23.25. НІКа.
23.40. Футбол-92. Вынікі тура.
23.55. Футбол. «Хімік» (Гродна)—«Дынамо» (Мінск).

Канал «Астанкіна»

8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. «Аператар Кыпс на бязлюдным востраве». Мультфільм.
10.10. Футбол. Еўрапейскія кубкі.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Задача з трыма невядомымі». Маст. фільм. 1-я серыя.
12.25. Кароткаметражны фільм.
12.55. «Безыменны замак». Маст. фільм. 3-я серыя.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Тэлемікст.
15.10. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.00. Праграма тэлебачання Японіі. «Гісторыя аўтамабільнай прамысловасці Японіі».
17.00. Навіны.
17.25. ...Да 16 і старэйшым.
18.05. «Багатыя таксама плачуць».
18.50. Дак. фільм.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Хіт-парад «Астанкіна».
21.55. Аўтаралі «Парыж — Масква — Пекін».
22.20. Чорная скрыня.
23.00. Навіны.
23.20. Лімпапо.
23.50. Любімыя песні.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
7.50. Кіпрас Мажэйка. «Рэпартажы з НАТО».
8.20. Вольны час. «Дамашняе кола».
8.35. Майстэрня музыкі. Перадача 1-я.
9.10. Здабытак рэспублікі. Наш Маціс.
9.40. Вінілавыя джунглі.
10.10. «Праўда і міфы пра вадародную бомбу».
11.10. «Граф Монтэ-Крыста». Маст. фільм. 3-я серыя.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Сігнал.
15.15. «Калі загаворыць камяні».
15.30. Пілігрым.
16.15. «Даравман». Мультфільм (Японія). 3-я серыя.
16.30. Там-там навіны.
17.30. Азы кар'еры.
17.45. Праграма «Ключ».
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Студыя «Нотабене».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Рэпардёр. «Нараджэнне».
19.45. «Граф Монтэ-Крыста». Маст. фільм. 4-я серыя.
21.15. Пятае кола.
22.00. Весткі.
22.20. Спартыўная карусель.
22.25. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
22.55. Пятае кола (працяг).

ТУРЦЫЯ Ў ЗАХАПЛЕННІ...

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛІНФАРМа ў пасольстве Турэцкай Рэспублікі, артысты Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі паказалі 8 верасня сваё майстэрства на сцэне самай прэстыжнай турэцкай канцэртнай залы — у Культурным цэнтры імя Атацюрка. 83 беларускія артысты прыбылі ў гэту краіну спецыяльным чартэрным рэйсам Аэрафлоту па запрашэнню турэцкага банка «Япі і Крэдзі». У першы вечар на суд патрабавальнага гледача быў прадстаўлены адзін з лепшых спектакляў ДАВТа — балет Арама Хачатурана «Спартак».

Да дэбюта на турэцкай сцэне трупа пад кіраўніцтвам галоўнага балетмайстра Валянціна Елізар'ева рыхтавалася задоўга да паездкі: прадумваўся рэпертуар, сцэнічнае афармленне спектакляў, ішоў старанны адбор прэтэндэнтаў ступіць на прэстыжныя падмосткі. Для гастроляў, якія прадоўжацца да 12 верасня, былі адабраны чатыры спектаклі. У той жа час у беларускіх артыстаў з'явілася магчымасць бліжэй пазнаёміцца з турэцкай культурай, сустрэцца з мясцовымі знатакамі мастацтва і калегамі.

Хочацца верыць, што добры пачатак культурнага супрацоўніцтва нашых краін будзе мець не менш удачны працяг.

Ачаг пад адкрытым небам

Ролю летняй кухні ў садзе можа выконваць драўляная чатырохколавая цялежка, прыкладна такая, як паказана на мал. 1. У яе скрынцы складзены прадукты, зверху дяжынь дошка, на якой расстаўлены посуд і г. д., а яшчэ вышэй прымацавана палічка з падвешанымі да яе кухоннымі прыладамі. Над цялежкай можна ўмацаваць парасон ці тэнт, якія будуць ахоўваць ад сонца. Увечары камплект далаўняецца лямпай ці каляровым ліхтаром.



Калі захочацца прыгатаваць гарачыя стравы, можна выкарыстаць вельмі простае прыстасаванне (мал. 2). Шампуры з шашлыком ці каўбаскамі можна пакласці на звычайныя керамічныя сасуды (мал. 3), напоўніўшы іх прыкладна напалавіну гарачым вугалем. Для забеспячэння цягі ў дне сасуда павінна быць адтуліна.

Самую простую садовую печку (мал. 1) можна зрабіць самому. Прама на зямлю кладзём квадратную тратуарную пліту (А). Вакол яе размяшчаем камяні ці цаглін (Б), пакідаючы паміж імі прамежкі. Металічную трубку ці стрыжань (В) з некалькімі адтулінамі ў верхняй частцы забіваем дастаткова глыбока ў зямлю. У якасці пліты (Г) можна выкарыстаць рашотку для ачысткі падзіраў ад бруду, якая складаецца з металічных пласцін. Замацуем яе на патрэбнай вышыні пры дапамозе штыра (Д), устаноўленага ў адну з адтулін трубкі (В). Паглыбленне паміж камянямі (Б) запаўняем драўняным вугалем.

Мал. 2 — вертыкальны разрэз.

Печку другога тыпу можна скласці з цаглін, злучаных іх глінай (мал. 3). Як класці цагліны, відаць на малюнку. Выгляд спераду паказаны на мал. 4, дзе А — паверхня для гатавання, Б — уласна печка, В — паддувала.

ЗААПАРК У КВАТЭРЫ

Вы набылі кацяня

У першы ж дзень прывучыце кацяня да туалета. Пастаўце два невялічкія пластмасавыя тазікі: у адным ён будзе пакідаць лужыцы», другі патрэбен для больш «сур'ёзных спраў». Калі кацяняці паставіць толькі адзін посуд, ён можа «другое» рабіць дзе папала. У тазікі-туалеты пакладзіце парваную паперу. Наглядайце за кацянём. Як толькі яно пачне шукаць месца, пасадзіце яго ў адзін з тазікаў. Можна нават закрыць кацяня на ноч у туалеце, дзе стаяць тазікі. З падлогі прыбярыце ўсё, што можа быць выкарыстана ім для сваіх спраў — анучы і г. д. Пакіньце толькі мяккую і цёплую падсцілку, дзе яно будзе спаць. Выпусціце яго раніцай, калі адзін з тазікаў будзе апрабаваны. Звычайна выкарыстаўшы тазік упершыню, кацяня вяртаецца да яго зноў, таму сачыце, каб посуд заўсёды быў сухім і чыстым. У забруджаны тазік кацяня не пойдзе і будзе шукаць іншае, больш падыходзячае месца. Тазікі мыйце пасля кожнага іх выкарыстання. Не адкладвайце мыццё і замену паперы на «потым».

ПРЫЕМНАЙ ПРАГУЛКІ

Прывучыце кацяня да ашыйніка і павадка, каб, не баючыся за яго лёс, у свабодны час выводзіць яго на прагулку. Самы просты ашыйнік звяжыце на спіцах «гумай». Ён расцягваецца, таму яго лёгка надзяваць і здымаць праз галаву. З такім хатнім ашыйнікам кацяня выглядае яшчэ сімпатычней. Калі паспрабуе зняць надзеты ашыйнік, пагуляйце з ім. Прыйдзе час, калі кацяня зусім не будзе звяртаць увагі на гэту прыладу.

Для прагулак на вуліцы спатрэбіцца спецыяльны ашыйнік. Тут зручна выкарыстаць нешырокі і мяккі раменьчык для наручнага гадзінніка. Калі кацяня прывыкне да ашыйніка, яго прывучаюць і да павадка. Павадок прышпільваюць да металічнага ці пластмасавага кальца на ашыйніку. «Пагуляйце» з кацянём на павадку па кватэры: спакуса пагуляць з павадком у яго вялікая, таму спачатку паспрабуйце кароткі павадок, а потым доўгі. У першыя дні будзьце асабліва ўважлівымі на вуліцы: кацяня палохаецца машын, чужых людзей, незнаёмых пахаў. Таму першыя прагулкі павінны быць непрацяглымі. Потым іх можна падоўжыць.

АБ ЗДАРОЎІ КАЦЯНЯЦІ

Пасля прагулкі прыходзіцца мыць кацяня, асабліва калі на вуліцы мокра. Але часта гэта не рабіце: яно добра вылізваецца само. Ад частага купання ў кацяняці пачне вылазіць поўсць, скура стане сухой. Анучай, змочанай у цёплай вадзе, можна кожны дзень выціраць лапы. Мыццё патрэбна, калі ў кацяняці ёсць блохі. Перыядычна правярайце вушы і пры неабходнасці чысціце іх ватай ці мяккай анучкай з некалькімі кроплямі алею ці вазеліну. Унутраная паверхня вушных ракавін павінна быць ружовай. Калі вушы брудныя, кацяня чухае іх, і часта трасе галавой. Трэба неадкладна звярнуцца да ветэрынарнага ўрача.

Як вызначыць якасць будаўнічых матэрыялаў

Многія самадзейныя будаўнікі цікавяцца, як практычна, не звяртаючыся да лабараторных праверак, вызначыць якасць будаўнічых матэрыялаў. Веданне простых прыёмаў ацэнкі вядзе да эканоміі будаўнічых матэрыялаў, паляпшае якасць будаўніцтва, як вынік, зніжае яго кошт.

ЦЭМЕНТ

Ён лічыцца якасным, калі не мае прыкмет камякавацасці. Калі добры цэмент узяць у кулак і сціснуць, то ён адразу выцеча (прасыплецца) паміж пальцамі. Калі ж у руцэ застануцца дробныя кавалачкі велічынёй з гарошыну і больш, то гэта гаворыць аб тым, што ў ім пачаўся працэс утварэння камякоў і такі цэмент мае паніжаную актыўнасць і, адпаведна, зніжаецца трываласць матэрыялаў на яго аснове.

У час захоўвання цэменту яго актыўнасць як матэрыялу, што звязвае, падае прыкладна на 5 працэнтаў штомесяц. Так, пры захоўванні на працягу 3 месяцаў актыўнасць змяншаецца да 15—20 працэнтаў, на працягу аднаго года — да 30—40 працэнтаў, на працягу 2 гадоў — да 40—50 працэнтаў.

ВАПНА

Якасць вапны можна вызначыць наступным чынам. На растворы, дзе адна частка вапнавага цеста і тры часткі пяску, складваецца слупок з 8 штук чырвонай паўнацелай цэглы. Праз чатыры дні слупок асцярожна падымаюць за верхнюю (восьмую) цагліну. Калі слупок не абвалецца, то вапна лічыцца дабраякаснай.

ШЫФЕР ДАХАВЫ АСБЕСТАЦЭМЕНТНЫ

Правяраецца знешнім аглядам. Лісты не павінны мець падоўжных трэшчын. Шыфер, які доўгі час захоўваўся пад адкрытым небам, пад уздзеяннем вільгаці набывае цёмны колер, што сведчыць аб панижанай трываласці.

Для праверкі адбіраюць са стоса трэці ліст зверху. Сухі ліст хвалістага шыферу, пакладзены на роўную аснову, вытрымлівае вагу стаўшага на яго чалавека і не разбураецца.

ЦЭГЛА

Бледна-ружовы ці карычневы колер цэглы сведчыць аб недапале, такая цэгла нетрывалая, моцна ўсмоктвае ў сябе ваду, пэцкае рукі, пры ўдары чуваць глухі гук. Прымяняецца там, дзе яна не падвергнута дзеянню атмасферных ападкаў.

Чырвоная цэгла — нармальна абпаленая, яна цвёрдая і трывалая, дрэнна ўсмоктвае ваду, пры ўдары чуваць чысты гук. Такая цэгла добра складуецца, на зломе мае аднародную будову без пустот, без каменьчыкаў, без вапны. Выкарыстоўваецца для кладкі сцен, печак, камінаў.

Цёмна-буры колер сведчыць аб тым, што цэгла перапаленая, так званы жалязняк. Паверхня перапаленай цэглы шклопадобная, з глыбокімі трэшчынамі. Цэгла-жалязняк вельмі цвёрдая, амаль не ўсмоктвае вады, таму дрэнна вяжацца з растворам. Добра супраціўляецца вільгаці і марозу, ужываецца для кладкі фундаментаў.

Якасць цэглы можна вызначыць пробай на ўдар. Цэгла нізкіх марак (да 75) ад аднаго ўдару малатком вагой 1 кг разбіваецца на шчэбень. Цэгла маркі 100 разбураецца на больш дробныя кавалкі ад некалькіх удараў. Цэгла маркі звыш 100 пры слізгаючых ударах малатка іскрыць і адбіваецца дробнымі кавалкамі.

Вядомы і такі просты спосаб вызначэння якасці: цэгла нізкіх марак пры падзенні з вышыні 1,2—1,5 м на цвёрдую каменную аснову разбіваецца на дробныя кавалачкі. Калі цаглина разаб'ецца на 2—3 буйныя кавалкі, яна лічыцца добрай якасці.

ПЯСОК

Пясок павінен быць чыстым, без прымесяў гліны, зямлі, пылу. Чысты пясок не пэцкае рукі. Дробны пясок мае зярняты менш за 1,5 мм, пясок сярэдняй буйнасці — ад 2 да 2,5 мм, буйны — больш за 2,5 мм.

569

ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ

18 верасня, ПЯТНІЦА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Фізкульт-ура!» Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 10-ы клас.
9.40. «На сямі вятрах». Маст. фільм.
15.25. На атрыманне Дзяржаўнай прэміі Беларусі. «Плач перапёлкі». Маст. фільм. 4-я серыя.
16.30. Навіны.
16.35. «Два клёны». Мультфільм.
17.10. Голас. Літаратурна-мастацкі відэаканал для школьнікаў.
18.00. Дак. фільмы.
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Творчыя партрэты. Народны паэт Беларусі Максім Танк.
19.55. Бізнес-клуб «Партнёр». Выйсце з крызісу ёсць. Перадача 2-я.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «На сямі вятрах». Маст. фільм.
23.20. НІКа.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. «Каля і Бука». Мультфільм.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя танцамі плачуць».
9.05. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
9.55. ...Да 16 і старэйшым.
10.35. «Коля, Оля і Архімед». Мультфільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Задача з трыма невядомымі». Маст. фільм. 2-я серыя.
12.25. «Экзамен на чын». Кароткаметражны фільм.
12.55. «Безыменны замак». Маст. фільм. 4-я серыя.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Брыдж.
14.50. Бізнес-клас.
15.05. Бланнот.
15.10. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.00. Іграе Э. Грач (скрыпка).
16.20. Цэнтр.
17.00. Навіны.
17.20. Погляд з правінцыі. Ці вытрымае рэформы спіна селяніна.
17.40. Крэшчэндо.
17.55. Фільм — дзецям. «Прыгоды чорнага Прыгажуна». 10-я серыя.
18.20. Чалавек і закон.
18.50. Поле цудаў.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Фанат». Маст. фільм.
22.15. ВІД прадстаўляе. «Музагляд».
23.00. Навіны.
23.20. Адпачывай.
23.35. Праграма «Такі»
0.05. Пляцоўка «Музагляду».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Студыя «Нотабене».
8.55. Вольны час. «ТВ-атэлье».
8.50. М-трэст.
9.05. Іграе гітарыст Анатолій Болатаў.
9.30. Начны акцёрскі клуб у ранішнім эфіры.
10.40. «Бурда модэн» прапануе...
11.10. «Граф Монтэ-Крыста». Маст. фільм. 4-я серыя.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. «Раджа-Хёга для ўсіх». Перадача 1-я.
16.15. Там-там навіны.
16.30. «Пераказ». Відэафільм.
16.50. Дысней па пятніцах. «Юны Гары Гудзіні». Маст. фільм (ЗША). Частка 1-я.
17.45. Давайце разбяромся.
18.00. Белая варона.
18.45. Крымінальныя паведамленні.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Вуснамі дзіцяці.
20.00. У свеце аўта- і мотаспорту.
20.30. «Асабістая справа суддзі Івановай». Маст. фільм.
22.00. Весткі.
22.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
22.50. Вячэрні салон.

19 верасня, СУБОТА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Зялёнымі прасторамі». Фільм-канцэрт.
9.15. «Вайна і мір». Маст. фільм. «Андрэй Балконскі». Частка 1-я.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Паказвае Віцебск. «Шагалаўскія дні».
12.15. «20 хвілін рэдактара.
12.35. «Дзяўчынка і леў», «Адна кропля». Мультфільмы.
13.00. «Помнікі расказваюць». Прадстаўляе Варонежская студыя тэлебачання.
13.15. Творчае аб'яднанне МЭТА. «Ветразі трывог». Тэлеканавелы.
14.30. Майстры оперный сцэны. Перадача 1-я.
15.25. Паміж намі, жанчынамі... «Два дні з жыцця лагера адпачынку «Зубраня». Частка 1-я.
16.10. Для школьнікаў. «Сігма-92». Фестываль бальных танцаў (паўтор).
17.10. «Сцэна — жыццё маё». Творчы партрэт народнай артысткі Беларусі А. І. Клімавай.
18.15. Бізнес-клуб «Партнёр». Выйсце з крызісу ёсць. Перадача 3-я.
19.00. Адкрыццё Тыдня Сычуаньскага тэлебачання.
19.30. «Падарожжа па правінцыі Сычуань». Дак. фільм.
19.50. Маст. фільм для дзяцей. «Добры хлопчык». 1-я серыя.
20.10. Рамансы П. Чайкоўскага і С. Рахманінава.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.35. «Песні заходняга Кітая». Музычны фільм. 1-я серыя.
22.05. «У мяне над галавой неабсяжнае блакітнае неба». Маст. фільм. 1-я серыя.
22.45. НІКа.
23.00. Спаборніцтвы па гарадошнаму спорту на прыз Беларускага тэлебачання.

Канал «Астанкіна»

6.00. Навіны.
6.20. Ранішняя гімнастыка.
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. Спорт-шанц.
8.00. «Марафон-15» — малышам.
8.25. Дапамажы сабе сам.
8.55. Радыё «Труба».
9.25. Жывое дрэва рамёстваў.
9.30. Інстытут чалавека.
10.00. «Ірландскія сустрэчы». Аб Міжнародным форуме жанчын.
10.30. «Маленькія цуды». Мультфільм.
10.40. Фільмы нашай памяці. «Дарагі мой чалавек».
12.40. Музычны кіёск.
13.30. «Легенда боінга». Частка 1-я. «Крылатыя сапернікі».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.15. Студыя «Палітыка» паказвае.
14.55. «Казка аб казцы». Маст. фільм.
15.50. Канцэрт «Падзяка». Культурная акцыя.
17.50. Чырвоны квадрат.
18.30. «Яноты». Мультфільм (Канада)
18.55. Тэлевізійнае знаёмства. Урмас От гутарыць з Інакенцыем Смактуноўскім.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Зімняя вішня». Маст. фільм.
22.05. Пад знакам задыяка. «Дзева». У перапынку (23.00) — Навіны.
23.50. «Вечная песня кахання». Кінаканцэрт.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Дарога да храма.
7.45. Вольны час.
8.00. Свет спорту вачамі фірмы «Жылет».
8.30. Манера.
9.00. Рэтра. У. Шубарын.
9.30. «Зоркі Амерыкі». Выпуск 5-ы.
10.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
11.15. Як жыць будзем?
12.00. Пілігрым.
13.00. Весткі.
13.20. «Капітан Пілігрыма». Маст. фільм.
14.50. Тэма з варыяцыямі. «Дом сяброў».
15.10. «Музей сучаснага мастацтва». Да 1 Міжнароднага фестывалю арт-галерэй.
15.40. Мегаполіс.
16.10. Вечары ў Доме Гогаля.
17.00. Кантрасты.
17.45. Парламенцкі веснік.
18.00. «Санта-Барбара».
18.50. Экспедыцэнтр прадстаўляе...
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Залатая шпора.
20.00. «Воўк». Маст. фільм.
21.15. Ляпсус.
22.00. Весткі.
22.20. Праграма «А». Канцэрт групы «Кід Крэол энд Кокананс» (ЗША) на фестывалі «Рок-самер-92».
23.05. «Секс-індустрыя ў Расіі».

20 верасня, НЯДЗЕЛЯ

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Вайна і мір». Маст. фільм. «Андрэй Балконскі». Частка 2-я.
9.25. Урокі здароўя. Аб карысці ездаравіленчай хады і бегу.
9.55. Сёння — Дзень работніка лесу. «Цяжкае лета». Клопаты і надзеі работнікаў лясной гаспадаркі рэспублікі.
10.55. Прыкметы будучыні. Канцэрт «Беллеспрам».
11.25. Белыя і чорныя. Шашачны клуб.
12.05. «Сонечны зайчык». Мультфільм.
12.15. Для дзяцей. «Літарынка».
13.05. «Суперкніга». Мультфільм. 17-я серыя.
13.40. «Калі імгненню я скажу...» Інсцэніроўка паводле твора І. В. Гётэ «Фаўст».
14.55. Майстры оперный сцэны. Перадача 2-я.
15.55. Паміж намі, жанчынамі... «Два дні з жыцця лагера адпачынку «Зубраня». Частка 2-я.
16.40. Творчае маладзёжнае аб'яднанне «Крок» прадстаўляе... Існасць. Духоўна-рэлігійная праграма.
17.40. Творчае аб'яднанне МЭТА. «Ліфт-XX».
18.40. Шануйце песні свае. Народная спяначка Г. Радзюшэўская з в. Нарэйца Мядзельскага раёна.
19.20. Прадстаўляе Сычуаньскае тэлебачанне (Кітай). «Яр Хайлагаў». Дак. фільм.
19.35. Фільм — дзецям. «Добры хлопчык». 2-я серыя.
20.00. Панарама.
20.25. «Свабодны тыран», «Парк культуры». Мультфільмы для дарослых.
20.40. Калыханка.
21.05. Студыя «Тэлесябрына», «Пепсі-ТОП-30». Перадача 1-я.
21.55. Прадстаўляе Сычуаньскае тэлебачанне (Кітай). «Песні заходняга Кітая». 2-я серыя.
22.25. «У мяне над галавой неабсяжнае блакітнае неба». Маст. фільм. 2-я серыя.

Канал «Астанкіна»

6.00. Гадзіна сілы духу.
7.00. Тыраж «Спортлата».
7.10. «Бабуля, навучы». Мультфільм.
7.20. «Украінскія вячоркі». Фільм-канцэрт.
8.00. Раным-рана.
8.30. Магчыма ўсё.
9.00. Раніцная зорка.
9.50. Свет у вольны час.
10.30. Пад знакам «пі».
11.20. Новае пакаленне выбірае.
12.10. Былое.
12.50. «Метамарфозы жывапісу». 7-я і 8-я серыі.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Студыя «Палітыка» паказвае.
14.55. Клуб падарожнікаў.
15.45. Народныя мелодыі.
16.00. Панарама.
16.40. Тэлелоцыя.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.05. Праменад у Марыінскім.
19.00. Навіны кіно.
19.25. «Зімняя вішня-2». Маст. фільм.
21.00. Выніки.
21.45. Спартыўны ўік-энд.
22.00. Брэйм рынг.
23.00. Навіны.
23.50. Аўтаралі «Парыж — Масква — Пекін».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. «Хто намалюе каня?» Дакументальны фільм.
7.40. Мульці-пульці. «Асляня».
7.50. Трэці, сібірскі, міжнародны.
8.20. Фальклор. «Невядомыя культуры».
8.50. Хочаце, верце...
9.20. Праграма «Эскулап» прадстаўляе фільм «Для вас, дзяўчаняты і хлапчаняты» (Галандыя).
9.30. Сялянскае пытанне.
10.00. «Прыгода ў каралеўстве». Мультфільм. 4-я серыя.
10.30. Аты-баты...
11.00. Вумеранг. Перадача аб праблемах адукацыі.
12.00. Кар'ера. Конкурс менеджэраў.
13.00. Весткі.
13.20. У. Сараян. «Выніўчэнне дзіцяцінства».
14.50. Сергій Раданежскі. Фільм 3-ці «Кулікоўская бітва».
15.20. Лёгкая атлетыка. Зборная Расіі — зборная Англіі.
15.40. У свеце жывёл.
16.40. Дак. панарама. «Святло яго зорак».
18.05. «Санта-Барбара».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Цэнтр Стаса Наміна (Эс-Эн-Сі прадстаўляе: «Клуб «Жоўтай падводнай лодкі».
20.00. Фестываль класічных фільмаў Галівуда. «Шарада».
22.00. Весткі.
22.20. Спартыўная карусель.
22.30. Апокрыф. Выпуск 2-гі.

Інфармацыйнае агенцтва «БелаПАН» праводзіць дабрачынную акцыю «Беларусь без межаў». Сутнасць яе — у бясплатным размеркаванні каля трох тысяч асобнікаў кніг на беларускай мове, падараваных нашай рэспубліцы беларускай дыяспарай Германіі. А менавіта — Юрыем Сянькоўскім, у недалёкім мінулым — дырэктарам Беларускай службы радыёстанцыі «Свабода», і Паўлам Урбанам, гісторыкам, супрацоўнікам «Свабоды».

Гэтыя кнігі былі выдадзены выдавецтвам «Бацькаўшчына», якое дзейнічала ў Мюнхене (ФРГ) у 50-я — 60-я гады пры аднайменнай газеце.

Беларускія кнігі вяртаюцца з эміграцыі

— Мы ведаем і высока цэнім высілкі беларускіх патрыётаў на Радзіме, накіраваныя на нацыянальнае адраджэнне,— гаворыць ініцыятар акцыі Ю. Сянькоўскі.— Просім разглядаць перасланыя намі кніжкі як сціплы падарунак беларускай эміграцыі грамадству на Бацькаўшчыне ў часы абнадзейвальнага змагання за нацыянальнае вызваленне. Ведаючы, што на Беларусі адчуваецца нястача літаратуры на роднай мове, мы спадзяёмся, што кнігі нашага выдавецтва знойдуць свайго чытача. Акрамя таго, на нашу думку, яны дапамогуць асвоіць больш правільнае беларускае вымаўленне, асабліва слоў са змякчанымі зычнымі гукамі.

Па сутнасці, гэты падарунак — цэлая бібліятэка беларускай патрыятычнай літаратуры. У яе ўваходзяць і творы шырокавядомых у нас у рэспубліцы аўтараў — Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Якуба Коласа, — і малавядомых нашым чытачам Вацлава Ластоўскага, Алеся Гаруна, Юркі Віцьбіча, Андрэя Мрыя, Рыгора Крушыны, Лукаша Калюгі... Аднак гэтыя кнігі каштоўныя не толькі самі па сабе, але і сакавітай, сапраўды беларускай мовай, якая пасля гвалтоўных рэформ беларускага правапісу таксама вымушана была «эмігрываць». І што яшчэ важна — усе выданні суправаджаюцца багатым крытычным матэрыялам, у якім творы мастацтва разглядаюцца не з інтэрнацыянальна-бальшавіцкіх пазіцый, а з пазіцый беларускага нацыянальнага адраджэння. Ці варта казаць, як патрэбен ён нашай школе, што так стамілася ад ідэалагічных догмаў?!

Выдаткі па перавозцы гэтага дабрачыннага грузу ўзялі на сябе інфармагенцтва «БелаПАН» і сумеснае прадпрыемства «Зубр». Асабліва хочацца падзякаваць дырэктару «Зубра» Сяргею Кліорыну, які падтрымаў ідэю правядзення акцыі не на словах. Гэта сумеснае прадпрыемства ўзяло на сябе асноўную частку расходаў, звязаных з перавозкай кніг з Мюнхена ў Мінск. Чаго гэта каштавала, можна здагадацца хаця б па пабочных абставінах: за аплату выдаткаў на перавозку не ўзяліся ні ўрадавыя структуры, куды я звяртаўся, ні структуры новага бізнесу (у іх ліку нават камерцыйны банк «Беларусь»). Зразумела, куды ўкладваць грошы, якія акцыі фундаваць,— асабістая справа кіраўніцтва камерцыйных структур. Аднак ёсць жа і маральны бок: скажы мне, куды ты ўкладваеш грошы, і я скажу... Зрэшты, ад нашай спрэчкі, паважаны businessman, мала што зменіцца: па-ранейшаму нацыянальнае Адраджэнне будзе заставацца справай энтузіястаў, якія змушаны будуць абіваць парогі офісаў і прасіць, быццам аб асабістай ласцы...

Аднак дабрачыннасць і ейная адраснасць — тэма асобнай гаворкі. Гэты ж матэрыял напісаны адзіна дзеля таго, каб паведаміць: каля 3 тысяч асобнікаў кніг, што ўяўляюць каштоўнасць яшчэ і з букіністычнага пункту гледжання, чакаюць сваіх чытачоў. Жадаючыя бясплатна атрымаць іх могуць прысылаць заяўкі (з абавязковым змяшчэннем свайго адраса і нумара тэлефона) на адрас: 220030, Мінск, Брылеўскі тупік, 55. Інфармацыйнае агенцтва «БелаПАН». Тэлефон: 78-14-27. Спіс кніг даецца вышэй. У першую чаргу будуць задаволены заяўкі школ і бібліятэк.

Алесь ЛІПАЙ,
генеральны дырэктар БелаПАН.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

для бясплатнага размеркавання ў рамках акцыі «Беларусь без межаў»

Аўтар	Назва	Колькасць асобнікаў
Янка Купала	«Спадчына»	570
Янка Купала	«Тутэйшыя»	330
Якуб Колас	«Сымон-музыка»	340
Якуб Колас	«У палескай глушы»	160
Якуб Колас	«Новая зямля»	40
Зборнік	«Беларускія казкі»	240
Максім Багдановіч	«Вянок»	110
Вацлаў Ластоўскі	Творы	80
Рыгор Крушына	Выбраныя творы	70
Альманах твораў	«Ля чужых берагоў»	300
Юрка Віцьбіч	«Плыве з-пад святое гары Нёман»	240
Алесь Гарун	«Матчын дар»	40
Лукаш Калюга	«Нядоля Заблоцкіх»	80
Андрэй Мрый	«Запіскі Самсона Самасуя»	330

ЗАПРАГРАМУЙЦЕ СВАЁ ЗАЎТРА...

Dainova Co Ltd

ТЭЛЕБАЧАННЕ

11 верасня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Каму сняцца коні...» Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 10 клас.
9.40. Маст. фільм «Музычная гісторыя».
16.30. Навіны.
16.35. «Пабочным асобам уваход дазволены». Маст. фільм.
17.50. «Знарок». Мультфільм.
18.00. Дак. фільм «Дарога».
18.25. Футбол. «Дынамо» (Мінск) — «Трактар» (Бабруйск). У перапынку (19.10) — Абласныя навіны (Магілёў).
20.20. Вершы Б. Пастарнака ў перакладах беларускіх паэтаў.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.35. Маст. фільм «Музычная гісторыя».
23.00. Бізнес-клуб «Партнёр» прапануе... Дабрачынны тэлеаўкцыён.
23.05. НІКа.
23.20. Футбол-92. Вынікі тура.
23.35. Футбол. «Ведрыч» (Рэчыца) — КІМ (Віцебск).

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. «Бабульчын парасон». Мультфільм.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя танцамі плачуць».
9.05. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
9.50. «Аліса ў краіне цудаў». Мультфільм.
10.20. Наш музычны клуб.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Вяртанне Вудулая». Маст. фільм. 4-я серыя.
12.25. «Сям'я». Кароткаметражны фільм.
12.50. «Лятучая мыш». Маст. фільм. 2-я серыя.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Брыдж.
14.50. Бізнес-клас.
15.15. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.05. На III Міжнародным фестывалі тэлепраграм для дзяцей і юнацтва.
16.20. Цэнтр.
17.00. Навіны.
17.25. Максіма.
17.55. Чалавек і закон.
18.25. Фільм для дзяцей «Прыгоды чорнага Прыгажуна». 9-я серыя.
18.50. Поле цудаў.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Амерыканскі маст. фільм «Ніколі не кажы «ніколі».
23.00. Навіны.
23.20. Музагляд.
0.00. «Адпачывай!»

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Студыя «Нотабене».
8.35. Майстры. «Усмешка Самойлава».
9.30. Адкрыты чэмпіянат ЗША па тэнісу.
10.20. М-трэст.
10.35. Экзотыка.
11.35. Вольны час. «ТВ-атэлье».
11.50. «Санта-Барбара».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Спявае Валерый Агафонаў.
15.45. Паралельныя сусветы.
16.30. Там-там навіны.
16.45. Панове-таварышы.
17.00. Уолт Дысней па пятніцах. «Мастацтва Уолта Дысней».
19.00. Весткі.
18.20. Свята кожны дзень.
19.30. Вуснамі дзіцяці.
20.00. У свеце аўта- і мотаспорту.
20.30. Крымінальныя паведамленні.
20.40. Тэатральны раз'езд. Наталля Макарава і Раман Вікцюк.
22.00. Весткі.
22.20. Давайце разбяромся.
22.30. «Шматкроп'е над «і». Перадача 3-я.
23.00. «Інтэрвенцыя». Маст. фільм.

12 верасня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Маст. фільм «XX стагоддзе пачынаецца». 1-я серыя
10.00. Паказвае Гомель. Інфармацыйна-публіцыстычная праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Дак. фільм «На сямі ўзгорках» (Смаленск).
11.45. Кікбаксінг. Міжнародны турнір у Маскве.
12.15. М. Булгакаў. «Звар'яцелы Журдэн». Спектакль Дзяржаўнага тэатра імя В. Камісаржэўскай. 1-я дзея.
13.15. «Сігма-92». Фестываль бальных танцаў.
14.15. «Паходня і балерына». Мультфільм.
14.25. М. Булгакаў «Звар'яцелы Журдэн». 2-я дзея.
15.20. Алоі Ёсць пытанне. Аб забеспячэнні насельніцтва лекамі расказвае генеральны дырэктар ВА «Велфармацыя» В. П. Гаранькоў. Прамая лінія.
16.20. Песню бярыце з сабою. 1-е аддзяленне.
17.35. Процістаянне. Маральна-прававая праграма.
18.20. Песню бярыце з сабою. 2-е аддзяленне.
19.35. Адраджэнне. «Пад знакам Пагоні», «Вянок цярновы васільковы», «Часцінка».
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.35. «Сінема» прадстаўляе маст. фільм «Yesterday» («Учора») (Польша).
23.05. Бізнесклуб «Партнёр» прапануе... Дабрачынны тэлеаўкцыён.
23.10. НІКа.

Канал «Астанкіна»

6.00. Навіны.
6.20. Ранішняя гімнастыка.
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. Спорт-шанц.
8.00. Як дабіцца поспеху.
8.15. «Марафон-15» — малышам.
8.40. Бумеранг.
9.10. Радыё «Труба».
9.40. Медыцына для цябе.
10.20. «Брава».
11.20. Экалагічная хроніка.
11.40. Праграма тэлебачання Японіі. «Цела чалавека: нараджэнне новага жыцця».
12.35. На III Міжнародным фестывалі тэлепраграм для дзяцей і юнацтва.
12.55. «Другая рэчаіснасць». Фільм 2-гі «Астравы».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Маст. фільм «Кубанскія казакі».
16.40. «Чырвоны квадрат».
17.20. У свеце жывёл.
18.00. «Яноты». Мультфільм (Канада). 4-я серыя.
18.25. «Атэль «Ля загінуўшага альпініста». Маст. фільм.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Брэйн-рынг.
21.40. «Гэты танец агнявы».
22.35. Аўтаралі «Парыж—Масква—Пекін».
23.00. Навіны.
23.20. «Не дапеўшы куплета». Памяці Ігара Талькова.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Дарога да храма. «У імя Уваскрэсення».
8.00. Свет спорту вачамі фірмы «Жылет».
8.30. Праграма «03».
9.00. Адкрыты чэмпіянат ЗША па тэнісу.
10.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
11.15. «Як жыць будзем?»
12.00. Пілігрым.
12.45. «Паўднёвыя Курылы. У чым праблема?» Вядучы — У. Цветаў.
13.00. Весткі.
13.25. «Выкраданне чарадзея». Маст. фільм.
15.05. «Бурда модэн» прапануе...
15.35. «Праўда і міфы пра вадародную бомбу».
16.35. Вінілавыя джунглі.
17.05. Парламенцкі веснік.
17.20. «У пошуках жанру». Леанід Філатаў.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Маскі-шоу.
20.00. «Хануcен». Маст. фільм (Венгрыя—ФРГ).
22.00. Весткі.
22.20. Канцэрт аркестра «Токіо Ска Парадайз» (Японія).
23.05. Адкрыты чэмпіянат ЗША па тэнісу.

РАДЫЁ

12 верасня

Апошнія паведамленні: 6.00, 7.50, 10.00, 15.00, 19.45, 23.00.
7.00 — раніцні канцэрт. 7.25 — вершы літоўскіх паэтаў. 8.00 — «Суботнім ранкам». Публіцыстычна - музычны выпуск. 9.15 — гуманітарна - інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». «Радыё-кантакт». 10.15 — «Званочак». Праграма для маленькіх. 11.00 — «Фальклор». Радыёклуб. 11.30 — аркестравыя творы. 12.00 — «Увайсці ў кожны дом...» Суботнія радыёсустрэчы. 12.30 — «Эстрадная студыя прапануе...» 13.00 — «Для веруючых і неверуючых». Радыёчасопіс. 13.30 — «Філантропы». 13.40 — «Справа». Хроніка двелавога жыцця». 13.50 — «Чалавек. Аўтамабіль. Дарога». 14.00 — вакальныя творы П. Булахава. 14.15 — «Гасцёўня». 15.15 — «Ансамбль». Музычная праграма. 16.05 — «На павароце». 17.00 — «Паўгадзіны з меламанам». Эстрадная праграма. 17.30 — «Спадчына». 18.00 — перадачы абласнога радыё. 19.00 — «Гасцінец». Рэкламная перадача. 19.20 — канцэрт харавой музыкі. 20.05 — вячэрняя казка. 20.30 — «Вячэрнія зарніцы». 21.00 — «Музычная поштка». 22.00 — «Дыскаклуб». 22.30 — лірычныя мелодыі. 23.10 — «Музыка на ўсе часы». 0.00—1.00 — «Начны канал».

НА ДВОР'Е

11 верасня

Сёння ўдзень па рэспубліцы ападкаў не чакаецца. Тэмпература паветра ў Віцебску — 16—18, Гомелі, Мінску і Магілёве — 17—19, Гродна — 18—20, Брэсце — 19—21 градус цяпла. У наступныя двое сутак: 12 верасня без ападкаў, 13-га па поўначы рэспублікі невялікі дождж. Тэмпература паветра 12-га верасня ўначы 4—9, 13-га —6—11 градусаў цяпла, удзень —15—20 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

ФІРМА "ASPRO" ПОЛЬШЧА

на выстаўцы-продажы «ІНТЭРКАНТАКТ-92» з 15 па 18 верасня

ПРАПАНУЕ:
лепшыя і танныя прадукты, віно, цыгарэты, красоўкі і інш.
АПЛАТА Ў РУБЛЯХ І СКВ.

АДРАС ВЫСТАЎКІ:
Мінск, вул. Чкалава, 7, ДК чыгуначнікаў.
Тэл. 24-24-09.

ПРАДАЮ

шчанят дога (з дакументамі).

Тэл. у Мінску 42-22-53.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАУЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін —32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 183.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ЗРАБІ САМ

Стэлаж з лесвіц

Паліцы падтрымліваюць сасновыя або бярозавыя рамы, сабраныя на кляі. У залежнасці ад размяшчэння ў пакоі і прызначэння стэлажа размер рам і крок перакладзін могуць быць рознымі. Паліцы робяцца са стружкавых пліт. Грані іх аздабляюць рэйкамі. Перад афарбоўкай усе дэталі насычаюць марылкай і некалькі разоў пакрываюць нітраабо мэблевым лакам. Для большай устойлівасці верхнюю частку рам можна прымацаваць да сцяны.



Падсвечнік – «канструктар»

Такі падсвечнік упрыгожыць сервант або кніжную шафу. Падыдзе любая драўніна з прыгожай тэкстурай. Набор дэталей, які нагадвае драўляны канструктар, дазваляе збіраць падсвечнік рознай канфігурацыі. Тут кожнаму дапаможа яго фантазія.

ЧЫСЦІМ, МЫЕМ

Плецены абажур на кухні

наколькі прыгожы, настолькі ж і непрактычны. З вуліцы ляціць пыл, ад пліты — пара ўперамешку з тлушчам, і ўсё гэта разам асядае, дабаўляючы клопату, якога і без таго хапае. Да таго ж, у адрозненне ад кошыкаў, абажуры не разлічаны на нагрузкі, у тым ліку і па адмыванню. Самым простым спосабам падтрымліваць яго ў чысціні — сухая чыстка старой зубной шчоткай. Пыл з тлушчам утвараюць галкі, якія падаюць на падсцеленую газету. Уся аперацыя займае 10 хвілін.

Засохлыя плямы бустылату

вадой ужо не адмываюцца. Таму, абклеіўшы сцяну цыратай ці плёнкай, трэба ў той жа дзень працерці швы вільготнай анучкай. Праз некалькі дзён, як правіла, выяўляецца, што сям-там засталіся недамытыя сляды клею, якія мокрая ануча ўжо не бярэ. Выкарыстоўваць абразівы—значыць падрапаць паверхню. Засохлыя тонкія сляды ад анучы, выпацканай клеем, лепш за ўсё сціраюцца мяккай белай гумкай. (Падыдуць нават тыя дарагія і прыгожыя, што з'явіліся ў магазінах некалькі гадоў назад і аказаліся зусім непрыдатнымі для выкарыстання па прамому прызначэнню). Прычым не вельмі важна, быў рамонт тыдзень, месяц ці год назад.

РЫБАЦКІЯ ЗГАДКІ

З вопыту бывалых

● Трэба ведаць, што рыба ўвосень, асабліва позняю, клюе не толькі раніцай і ўвечары, але і на працягу ўсяго дня.

● Восень — час збору яблыкаў. Разразаючы яблыкі з чарвяточынай, рыбалоў можа знайсці ў сярэдзіне пладажэрку. Лічынка гэта — вельмі добрая нажыўка пры лоўлі многіх відаў рыб.

● У кастрычніку асабліва цікавая лоўля акуня на маляўку. Натрапіўшы на чародку гэтых чырванапёрых рыб, сумаваць не будзеце. А вось знайсці іх рыбаку дапамогуць... чайкі. На тым месцы, дзе яны з крыкам кідаюцца ў ваду, сабраліся маляўкі. Значыць, тут палюе і паласаты драпежнік — акунь.

● Да самага ледаставу можна паспяхова лавіць шчупакоў з лодкі, прымяняючы вялікія блешні — белыя ці жоўтыя. А яшчэ лепш лавіць іх на жыўца. Шчупак трымаецца ў гэты час у прыбярэжных зарасніках, дзе заўсёды гуляюць маляўкі.

● Восеньская лоўля ляшча будзе паспяховай, калі ведаеш месцы яго жыцця і паводкі. У асноўным гэта рыба трымаецца ціхай вады ў глыбокіх месцах, у ямах пад круцізнамі з гліністым, галечным, пясчаным заглееным дном. Насадка — гноевыя чарвякі, выпаўзкі, кашы з пахучым маслам.

ЦАЦКІ СВАІМІ РУКАМІ

Рукатворны крышталь

Кажуць, сціслась — сястра таленту. Ну, а ў тэхніцы самая блізкая яе сваячка — прастата. І яна, несумненна, адрознівае вынаходства амерыканскага школьніка Говарда Флейшэра. Паглядзіце. Усяго дванаццаць трубачак і кавалак авіямадэльнай гумкі, а якая цудоўная атрымалася рэч!

Сам Говард збірае са сваёй шасцівугольнай «сняжынкі» і плоскія, і аб'ёмныя фігуры (гл. мал. 1—5). Але, думаецца, гэта не мяжа.

Аднак спачатку прыйдзецца зрабіць галаваломку. Асноўны яе элемент — трубачкі. Размеры на малюнку прыведзены ўмоўна, іх жа можна зрабіць і меншымі, і большымі — карацей, па жаданню. Важна, каб усе атрымаліся аднаго дыяметра і даўжыні. За акном лета, а таму трубачкі здабыць не праблема. Пустыя чараціны, ашкураныя галіжкі бузіны—стрыжань іх мягкі, лёгка выдаляецца... Словам, матэрыял пад рукой. Пакрыйце падрыхтаваныя трубачкі слоем лаку, каб не гублялі выгляду, і пачынайце зборку.

Тут ёсць розныя рашэнні —два паказаны на малюнках. Паслядоўна нанізваючы трубачкі (гл. мал. уверсе), прыйдзецца выканаць дваццаць дзве аперацыі. Многавата? Тады выберыце схему, паказаную ніжэй. Тут ужо на чатыры аперацыі менш. А можа хто з вас знойдзе і карацейшае рашэнне.



САМ САБЕ МЕТЭАРОЛАГ

Восеньскае надвор'е

**У некалькіх выпусках «Хатняй энцыклапедыі» (з 22 мая па 3 ліпеня) мы надрукавалі шэраг матэрыялаў, у якіх расказвалася, як з дапамогай у